КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №4 (132)
◂ 6 ЛЮТАГА 2009 г.

# Новы Час



**СЯМЕЙНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КАМУНІСТА СІМАНЕНКІ**

Стар. 11

**АЛЯКСАНДР ПАТУПА:**
**ПРЫ ПЭЎНЫХ УМОВАХ ГРАМАДСКА-КАНСУЛЬТАЦЫЙНАЯ РАДА МОЖА ПРЫНЕСЦІ СТАНОЎЧЫЯ ВЫНІКІ**
**ЗЯНОН ПАЗЬНЯК:**
**ТРЭБА РАТАВАЦЬ НАЦЫЮ, А НЕ РЭЖЫМ**

Стар. 4

**АБЫВАЦЕЛЬ У ВАРУНКАХ КРЫЗІСУ**

Пра эканамічны крызіс не чуў хіба толькі глухі.

Стар. 6

**УСПАМІНЫ ПРА ЛЯВОНА БАРАЗНУ**

У мінулым годзе споўнілася 80 гадоў з дня нараджэння Лявона Баразны (1928–1972).

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**«Кім быць»**

**Беларусь рыхтуецца да перапісу 2009 года.**

Спроба фельетона ў выкананні Марыі Мартысевіч

▸ **АД РЭДАКТАРА**



Сэрца ў клетку. Студэнцкая работа

Аляксей Кароль

# ДВА Ў АДНЫМ

**Дзве падзеі апошнім часам мелі дастаткова шырокі грамадскі розгалас. Першая — стварэнне грамадскіх камісій пры ўладных структурах з запрашэннем у іх склад апазіцыянераў. Другая — прызыў у войска трох апазіцыйных моладзевых лідэраў: Франака Вячорку, Івана Шылу і Зміцера Хведарука. Адно, па логіцы, выключае другое, але, як не дзіўна, яны — узаемаабумоўлены.**

Два ў адным. І тры, і пяць, і... Бо аўтарытарная палітычная сістэма мае сваю шкалу каштоўнасцей і прыярытэтаў, якія, аднак, вызначаюцца адзінай мэтай, падпарадкоўваюцца адной звышзадачы — самазахаванню, утрыманню ўладных пазіцый. Любымі сродкамі.

На сучасны момант збег рознага кшталту абставін прадыктаваў кіроўнай беларускай групоўцы неабходнасць крэну на Захад. Але з дакладным разлікам, каб вымушаная паслабленні не абярнуліся нечаканай некантралюемай ланцуговай рэакцыяй перамен.

Стварэнне грамадскіх камісій — менавіта з таго ж набору маніпуляцый. Гэта далёка не прапанова "круглага стала", і нават не прапанова фармавання камісій пры першых-трэціх асобах, але пры асобах несамастойных. Якіх можна ў любы момант, у выпадку суровай неабходнасці ці ў выпадку перамогі "ястрабаў", абвінаваціць у скажэнні генеральнай лініі і паказальна пакараць.

Двайная перастрахоўка. І трэцяя: персанальнае запрашэнне ў склад камісій апазіцыянераў. Не вы выбіраеце, а мы. Каб нават і намёку не было на існаванне нейкіх апазіцыйных структур. Каб кінуць цень падазрэння ў калабарацыі на запрошаных. Каб захаваць за сабой свабоду рук у адносінах і да структур, і да асобаў: каму — пернік (дакладней, пакуль толькі абгортка ад перніка), каму — бізун.

Тактыка відавочная і для ўсіх запрошаных. З небагатым для іх выбарам: пайсці ці адмовіцца. У сітуацыі дыялога, як бы яе ні ацэньваць, рашэнне "пайсці" было лагічным. Але ж вядомая і рэцэптура такога рашэння: перавесці сваё персанальнае рашэнне на рашэнне той апазіцыйнай структуры, да якой належыць запрошаны, і дакладна сфармуляваць умовы свайго ўдзелу ў камісіі. Якія адначасова выступаюць і парасонам свайго асабістага маральнага і палітычнага гонару.

Першае не зрабіў ніхто. Пра свае ўмовы публічна заўважана засведчыў толькі Алег Трусаў. Не заўважанымі, на жаль, засталіся ўмовы, вылучаныя Жаннай Літвіной, старшынёй Беларускай асацыяцыі журналістаў. Якраз сур'ёзныя і прынцыповыя: роўныя эканамічныя і прававыя ўмовы для ўсіх СМІ, акрэдытацыя журналістаў замежных СМІ, свабодны доступ да інфармацыі, заканадаўча афармленае вяртанне ўсіх незалежных СМІ ў сістэму распаўсюду, карэкціроўка новага закона аб друку.

Кантроль за інфармацыйнай прасторай для любога аўтарытарнага рэжыму з'яўляецца адной з галоўных умоў яго існавання. І менавіта на гэтай лініі дыялога-супрацьстаяння момант ісціны набліжаецца ўшчыльную. Бо 8 лютага ўступае ў сілу новы закон аб друку. Між тым на "круглым стале" па праблемах СМІ, арганізаваным 4 лютага Міністэрствам інфармацыі і АБСЕ з удзелам першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталляй Пяткевіч, ад незалежнай журналісцкай супольнасці прысутнічалі лічаныя асобы. Суадносіны для інфармавання грамадскасці, пра што там ішла гутарка і да якіх высноў прыйшлі, — відавочна нераўнапраўная.

Найбольш нечаканым і найменш матываваным на фоне дыялога, на фоне палітыкі лавіравання паміж Захадам і Усходам, выглядае прызыў у войска трох актывістаў моладзевага руху. Нават па крытэрах аўтарытарнай сістэмы. Прычым такі дэманстратыўна брутальны. З папярэднім выключэннем кандыдатаў у салдаты са школы і ВНУ, каб пазбавіць іх права на адтэрміноўку. З перапісваннем медычных заключэнняў. З уварваннем невядомых "камандас" у шпіталь. Збіццём і этапаваннем у кайданках да месца службы. З шэрагам іншых відавочных парушэнняў заканадаўства. З прапагандысцкім забеспячэннем: спецыяльны сюжэт па тэлебачанню ў "Панараме" з удзелам вайскоўцаў высокага рангу.

Здавалася б, навошта і каму гэта трэба? На фоне гучна абвешчаных дыялога і лібералізацыі? За два месяцы да заканчэння выпрабавальнага тэрміну, вызначанага ЕС для афіцыйнага Мінску? Відавочна ж, што ўстоям рэжыму хлопцы не пагражалі.

Ці не разлічылі, што аперацыя гэта атрымае такі розгалас? Ці, наадварот, гэта было мэтанакіраванае пасланне прыхільнікам перамен ад прыхільнікаў жорсткага курсу ўнутры сістэмы? Ці гэта было свядомым пасланнем Захаду: палітычных з турмаў выпусцілі, астатняе — наша ўнутраная справа? У пацвярджанне публічных заяў некаторых афіцыйных асоб: дыялог і эканамічныя прэферэнцыі без усялякіх папярэдніх палітычных умоў з вашага боку.

Усё робіцца зразумелым, калі паставіць аперацыю "прызыў трох" у агульную канву пераследу моладзевых дэмакратычных актывістаў. Гэта адзін з прэвентыўных удараў па тых, каго аўтарытарная сістэма лічыць найбольш небяспечнымі для сябе. Са статуснай апазіцыяй на сёння ўсё зразумела. Ёй — камісіі. А вось непакорнай моладзі — рэпрэсіі: не турма, дык армія. Запалохаць, раздрабіць, супрацьпаставіць адных другім — з правераных сродкаў. Аўтарытарная сістэма не можа існаваць без падсістэмы застрашвання. Мяняюцца толькі сродкі. Грамадства атрымала сігнал: поўны адкат не выключаны.

Пакуль наша рэчаіснасць не дае нам адказу, якая сіла, якая тэндэнцыя возьме верх у гэтай чорнай скрыні "два ў адным". Ведаем, праўда, агульны вынік: аўтарытарныя рэжымы непазбежна зжываюць сябе. А вось калі, раней ці пазней, — залежыць ад знешніх сіл уплыву.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГЛЫБОКАЕ

**Прыхільнікі рэгіянальнай газеты "Вольнае Глыбокае" падалі ў райвыканкам заяўку на правядзенне пікетаў.**



Пікеты чытачы збіраліся ладзіць у падтрымку выдання, якое яны не могуць набываць у шапіках "Белсаюздруку" і атрымліваць па падпісцы праз "Белпошту". Але ў правядзенні мерапрыемстваў было адмоўлена. Адзінае, што крыху суцешыла рэдактара газеты Яраслава Берніковіча, дык гэта адказ чыноўнікаў: "Я гадоў сем пішу розныя звароты і заявы ў выканкам. Сёння ўпершыню атрымаў адказ па-беларуску. Хоць з арфаграфічнымі памылкамі, але па-беларуску! Нават чытаць прыемна!"

### СВІСЛАЧ

**Раённыя ўлады прынялі рашэнне пра пабудову помніка ў гонар загінулых воінаў-афганцаў.**

Ён будзе размешчаны на алеі Герояў, дзе знаходзяцца помнікі Сталіну, Леніну, Траўгуду (герою вызвольнага паўстання 1863–1864 гадоў), воінам-вызваліцелям другой сусветнай вайны, а таксама Кастусю Каліноўскаму. Помнік Каліноўскаму, які, дарэчы, быў пастаўлены ў 2000 годзе, амаль адразу пачаў рушыцца. У мінулым годзе камунальныя службы горада яго знялі і паабяцалі грамадскасці ўсталяваць новы. Аднак неўзабаве быў разбураны пастамент, і гараджанам стала вядома, што на месцы помніка Каліноўскаму паўстане помнік воінам-афганцам.

### БЯРОЗАЎКА

**Працаўнікоў мясцовага шклозавода прымусілі даваць адбіткі пальцаў.**



Гэта прадпрыемства з'яўляецца горадаўтваральным, таму мала хто рызыкнуў пайсці супраць адміністрацыі і адмовіцца ад гэтай працэдуры. Іншую працу ў Бярозаўцы знайсці практычна немагчыма. Але некалькі смелых усё ж знайшлося, яны згадзіліся пакінуць свае адбіткі толькі пасля таго, як гэта зробіць сам дырэктар прадпрыемства.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

СУД

# ГОМЕЛЬСКІХ АКТЫВІСТАЎ АШТРАФАВАЛІ

**Суд Цэнтральнага раёна Гомеля аштрафаваў актывістаў апазіцыі за несанкцыянаваны пікет і непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі.**

3 лютага адміністрацыйныя пратаколы, складзеныя супрацоўнікамі палка патрульна-паставой службы УУС і дарожна-патрульнай службы ДАІ ў дачыненні да Канстанціна Жукоўскага, Андрэя Цянюты і Васіля Такарэнкі, разгледзела суддзя Марына Дамненка. Яна прызнала іх вінаватымі ва ўчыненні правапарушэнняў, прадугледжаных артыкуламі 23.34 і 23.4 КоАП (парушэнне парадку правядзення масавага мерапрыемства і непадпарадкаванне законным патрабаванням міліцыі).

Маладым людзям інкрымінавалася правядзенне 3 лютага незаконнага шэсця і пікета на плошчы Леніна. Актывісты пакараныя штрафам: А. Цянюта і В. Такарэнка — у памеры 80 базавых велічынь (2,8 мільёна рублёў), К. Жукоўскі — 100 базавых велічынь (3,5 мільёна рублёў).

А. Цянюта і В. Такарэнка былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі 3 лютага на плошчы Леніна з расцяжкай "КДБ нас з працы гоніць, Канстытуцыя абароніць?" і бел-чырвона-белым сцягам. К. Жукоўскі, які здымаў пікет на відэакамеру, таксама быў затрыманы.

Пры разглядзе адміністрацыйнай справы В. Такарэнка і А. Цянюта заявілі суддзі, што патрабуюць правядзення працэсу на беларускай мове, бо кепска валодаюць рускай і не зусім яе разумеюць. Хадайніцтва было адхілена на той падставе, што адміністрацыйная справа ў дачыненні да А. Цянюты ў верасні 2008 года слухалася на рускай мове, якую затрыманы разумеў тады добра. У хадайніцтве было адмоўлена таксама В. Такарэнку на той падставе, што ён скончыў сярэднюю школу з рускай мовай навучання і павінен ёю валодаць. В. Такарэнка паспрабаваў адказваць на англійскай мове. Па сутнасці адміністрацыйнай справы ён адмовіўся даваць паказанні.

**Паводле БелаПАН**

ДАМОВА

# АПЕРАТЫЎНАЕ РЭАГАВАННЕ

**Дамову аб стварэнні калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ падпісалі 4 лютага ў Крамлі лідэры краінаў, што ўваходзяць у гэтую міжнародную арганізацыю.**

Гэтыя сілы будуць выкарыстоўвацца для адбіцця ваеннай агрэсіі, правядзення аперацый супраць міжнароднага тэрарызму і экстрэмізму, ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый.

Плануецца, што калектыўныя сілы будуць знаходзіцца ў Расіі і ім будуць прыдавацца вайсковыя падраздзяленні іншых краінаў АДКБ.

Нагадаем, у склад АДКБ уваходзяць Беларусь, Арменія, Расія, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан і Узбекістан.

**Паводле "Радыё Свабода"**

АКЦЫЯ

# У ГОНАР КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

**Актывісты грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" вывесілі на будынку насупраць Акадэміі навук нацыянальны сцяг.**

Бел-чырвона-белы сцяг памерам 3 на 1,5 метра быў вывешаны ў гонар гадавіны нараджэння Кастуся Каліноўскага, лідэра нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863 года.

Таксама ўздоўж усяго праспекта Незалежнасці былі расклееныя плакаты з інфармацыяй пра дзень нараджэння Каліноўскага.

**jeans-by.com.**

СМІ




# КІНУТАЯ КОСТКА

**Ніхто не можа сказаць, чым закончыцца будучая перарэгістрацыя беларускіх СМІ, і які ўвогуле далейшы лёс незалежных сродкаў масавай інфармацыі.**

Нагадаем, што 8 лютага ўступае ў дзеянне закон «Аб сродках масавай інфармацыі», згодна з якім усе без выключэння сродкі масавай інфармацыі павінны да канца гэтага года прайсці перарэгістрацыю, што будзе праводзіцца па заяўляльным прынцыпе. Маўляў, неабходна толькі накіраваць па пошце запоўненую спецыяльную форму, і праз некаторы час таму ці іншаму СМІ будзе выдадзена новае пасведчанне.

А навошта ўвогуле праводзіць гэта дастаткова стратнае мерапрыемства?

Міністр інфармацыі краіны Уладзімір Русакевіч лічыць, што перарэгістрацыя неабходна, каб «правесці своеасаблівы пераўлік, пазбавіцца "мёртвых душаў" — СМІ, якія ўжо даўно дэ-факта спынілі сваё існаванне».

Старшыня Беларускага саюза журналістаў (БСЖ) Анатоль Лемяшонак таксама бачыць у гэтым толькі адны плюсы: «Мы, удзельнікі інфармацыйнага поля, павінны час ад часу пацвярджаць сваю гатоўнасць паўнавартасна працаваць. І незадаволеных тут быць не можа. Што ж тычыцца асцярогі асабліва пільных… Ну, ёсць пэўнае кола людзей, якія апрыёры ўсё ўспрымаюць у штыкі. Я думаю, што пасля таго, як закон уступіць у сілу, нараканняў у іх больш не будзе, і заяўнікі на сабе адчуюць зручнасці новай сістэмы».

Кіраўнік Цэнтра прававой абароны СМІ пры Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ) Міхаіл Пастухоў катэгарычна не згодны з гэтым меркаваннем: «Пасля ўступлення ў дзеянне новага закона аб СМІ і закона аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі, нас чакае далейшае закручванне гаек. Гэта закране як друкаваныя, так і электронныя СМІ. Асабліва цяжка будзе тым журналістам, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ».

Зазначым, што новы закон аб СМІ забараняе прафесійную дзейнасць журналістаў замежных СМІ на тэрыторыі Беларусі без адпаведнай акрэдытацыі. Згодна з новым законам, да адказнасці можна будзе прыцягваць і за «распаўсюджванне недакладнай інфармацыі, якая можа нанесці шкоду дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам».

Праўда, ёсць у згаданым законе аб СМІ і адзін вельмі станоўчы момант — інтэрнэт-выданням не трэба будзе рэгістравацца ў Міністэрстве інфармацыі. Як адзначыў намеснік старшыні БАЖ Андрэй Бастунец, гэты крок з боку Мініінфарма, безумоўна, станоўчы, але і тут ёсць свае падводныя камяні: «Савет Міністраў мог прытармазіць распрацоўку пастановы аб дзейнасці інтэрнэт-СМІ, каб прадэманстраваць еўраструктурам памкненне Беларусі выканаць іх патрабаванні па прывядзенні заканадаўства аб СМІ да дэмакратычных стандартаў. Але няма гарантыі, што пасля заканчэння выпрабавальнага тэрміну, вызначанага ЕС для беларускіх улад, сітуацыя не зменіцца ў горшы бок».

На думку намесніка старшыні БАЖ, гэты закон аб СМІ больш жорсткі за папярэдні яшчэ і таму, што ў органаў кантролю з'явіцца больш магчымасцяў для спынення дзейнасці СМІ ў судовым парадку.

Службовае пасведчанне адзінага ўзору таксама дае нямала падстаў для спекуляцый пры яго выдачы Міністэрствам інфармацыі.

Да таго ж нельга забываць, у якім стане зараз знаходзяцца незалежныя сродкі масавай інфармацыі Беларусі.

Дзесяткі закрытых незалежных газет. Шматлікія выпадкі зняволення рэдактараў і карэспандэнтаў незалежных выданняў. Збіццё соцень журналістаў недзяржаўных СМІ падчас вулічных мітынгаў і дэманстрацый. Адмова ў акрэдытацыі ўласным карэспандэнтам незалежных сродкаў масавай інфармацыі. Атрымліваецца, што, пусціўшы ў дзяржаўныя шапікі дзве газеты — "Народную волю" і "Нашу ніву", — усёй незалежнай прэсе кінулі своеасаблівую костку…

**Паводле інфармацыі БАЖ**

ПРАГРАМА

# ДЗЕНЬ ERASMUS MUNDUS

**18 лютага ў Брусэлі пройдзе інфармацыйны дзень адукацыйнай праграмы Еўрасаюза Erasmus Mundus. Як паведамляе прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Мінску, усе мерапрыемствы будуць транслявацца ў прамым эфіры праз інтэрнэт.**

Мэта інфармацыйнага дня — азнаёміць патэнцыяльных заяўнікаў з навінкамі праграмы на 2009–2013 гады і дэталёва растлумачыць асаблівасці праграмы, а таксама даць парады па падрыхтоўцы і падачы заявак на гранты.

У першы інфармацыйны дзень Erasmus Mundus адбудзецца прэзентацыя сумесных магістэрскіх і доктарскіх праграм і праграм партнёрства. Сярод галоўных новаўвядзенняў на 2009–2013 гады — павелічэнне ўдзелу нееўрапейскіх вышэйшых навучальных установаў у сумесных праграмах, падтрымка сумесных доктарскіх праграм, стыпендыі для еўрапейскіх і нееўрапейскіх студэнтаў і кандыдатаў у дактары.

Інфармацыйны дзень праводзяць бюро Еўракамісіі і Еўрапейскае выканаўчае агенцтва па пытаннях адукацыі, аўдыёвізуальнай прадукцыі і культуры (EACEA), якое адказвае за кіраванне праграмай Erasmus Mundus.

У адукацыйнай праграме могуць браць удзел грамадзяне Беларусі. Падрабязную інфармацыю можна атрымаць у прадстаўніцтве Еўракамісіі ў Мінску і ў Кіеве.

КАМПАНІЯ

# БХД — ЗА ДЭМАГРАФІЧНУЮ БЯСПЕКУ

Вольга Хвоін




**Аргкамітэт па стварэнню Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі распачаў маштабную кампанію па абароне сямейных каштоўнасцяў “Моцная сям’я — моцная Беларусь”. Кампанія, безумоўна, пазітыўная і карысная, але адначасова даволі наіўная. Бо вымагае не толькі заканадаўчых ды этычна-маральных захадаў з боку органаў улады, але і вялікіх фінансавых выдаткаў.**

Адной з надзённых праблем сённяшняй Беларусі актывісты БХД лічаць масавую колькасць абортаў. У якасці доказу прыводзіцца афіцыйная статыстыка Міністэрства аховы здароўя: штогод у клініках праводзіцца больш за 60 тысяч абортаў. Адмена забароны на аборты ў 1954–1955 гадах значна скараціла нараджальнасць: з 222 тысяч дзяцей у 1960 годзе да 108 тысяч у 2008-м. Ужо больш за 15 гадоў краіна знаходзіцца ва ўмовах дэпапуляцыі. За апошняе дзесяцігоддзе беларусаў стала менш на 400 тысяч, устойлівы спад надышоў з 1994 года.

Сустаршыня аргкамітэта па стварэнню БХД Аляксей Шэйн гаворыць, што віной таму паступовая дэградацыя маралі сучаснага беларускага грамадства. За 2007 год колькасць зарэгістраваных шлюбаў зменшылася на 9,8 працэнта, а колькасць разводаў узрасла на 15,2 працэнта. На кожную тысячу шлюбаў прыходзіцца 721 развод. У Мінску за першыя сем месяцаў мінулага года на 7842 шлюбы прыйшлося 4702 разводы. Яшчэ адным паказчыкам таго, што ў беларусаў з мараллю слабавата, хрысціянскія дэмакраты лічаць павелічэнне колькасці дзяцей, народжаных па-за шлюбам: у параўнанні з 70-мі гадамі мінулага стагоддзя, колькасць дзяцей, народжаных у няпоўных сем’ях, узрасла ў тры разы і штогод складае каля 20 тысяч.

Акрамя праблемы ненароджаных дзяцей і няпоўных сямей, БХД звяртае ўвагу і на масавую алкагалізацыю жыхароў Беларусі. У 2008 годзе, паводле дадзеных намесніка міністра гандлю Беларусі Міхаіла Свянціцкага, спажыванне алкаголю на душу насельніцтва склала 12,5 літра чыстага спірту, у той час як па дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя спажыванне алкаголю звыш 8 літраў вядзе да дэградацыі нацыі. У 2005 годзе гэтая лічба складала 9,4 літра на чалавека ў год. Спецыялісты сцвярджаюць, што каля 30 працэнтаў беларусаў у той ці іншай ступені хворыя на алкагалізм. Алкагалізм — страшная праблема, што разбурае асобу чалавека і руйнуе яго сям’ю: гэта прычына вялікай колькасці разводаў і сацыяльнага сіроцтва.

У межах дэмаграфічнай кампаніі аргкамітэт БХД накіраваў зварот прэзідэнту Беларусі, у Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, міністэрствы аховы здароўя, гандлю і адукацыі з просьбай прыняць адпаведныя меры і перагледзець шэраг пунктаў беларускага заканадаўства, што стварыла б умовы для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне. У прыватнасці прапануецца скараціць тэрмін цяжарнасці, калі дапускаецца свабоднае ажыццяўленне аперацый па штучнаму перарыванню цяжарнасці, з 12 да 10 тыдняў, увесці для лекараў права адмовіцца ад правядзення аборту па маральна-этычных перакананнях, арганізаваць інфармацыйную кампанію пра шкоду абортаў, алкаголю і тытуню для падлеткаў і моладзі. Прадугледзець дапамогу за дзіцём у памеры сярэдняга заробку на кожнае дзіця да пяці год і па 0,5 сярэдняга заробку да 10 гадоў.

Для барацьбы з алкагалізмам актывісты БХД прапануюць цалкам забараніць рэкламу алкаголю і тытуню, а таксама фірм, якія маюць дачыненне да іх вырабу, забараніць продаж алкаголю пасля 19.00 і ў святочныя дні, а тытунёвыя вырабы зняць з вітрын і прадаваць іх толькі на запыт пакупніка.

Мэта кампаніі — скараціць колькасць абортаў цягам бліжэйшых гадоў на 10–20 працэнтаў, колькасць разводаў — на 10 працэнтаў, а таксама давесці да беларусаў інфармацыю пра адказнасць за сваё жыццё і жыццё сваіх блізкіх.

Калі прапановы ў частцы дэмаграфічнай палітыкі падаюцца больш-менш ажыццяўляльнымі, хаця ўзнікаюць вялікія сумневы, што дзяржава раскашэліцца на такую фінансавую падтрымку для бацькоў (а менавіта фінансавыя праблемы для многіх жанчын становіцца вырашаючым, калі з’яўляецца пытанне нарадзяць ці не нараджаць дзіця), то антыалкагольныя і антытытунёвыя захады наўрад ці магчыма рэалізаваць бліжэйшым часам хаця б таму, што дзяржава атрымлівае вялікі прыбытак ад гандлю таварамі гэтай групы. А фірмы, якія займаюцца іх вытворчасцю і рэалізацыяй, маюць добрае лобі і зробяць усё магчымае, каб не страціць рынкі збыту і сваю групу пакупнікоў.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГРОШЫ ВАШЫ — СТАНУЦЬ НАШЫ

Сяргей Салаўёў

**Беларуская дыпламатыя перажыла чарговую перамогу. Мы ўсё ж здолелі выцягнуць з Расіі абяцанне даць нам яшчэ адзін крэдыт, ці прынамсі разгледзець мэтазгоднасць яго выдачы. І ўсё — амаль за так.**

Расія і Беларусь 3 лютага заключылі пагадненне пра сумесную ахову знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы ў паветранай прасторы і стварэнне Адзінай рэгіянальнай сістэмы супрацьпаветранай абароны (СПА). Дакумент падпісаны ў Крамлі па выніках пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы ў прысутнасці прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева.

Варта зазначыць, што ініцыятыву стварэння адзінай аб’яднанай сістэмы СПА дзвюх краін бакі абмяркоўвалі прыкладна з 1998 года. Як заяўляў у кастрычніку 2008 года галоўнакамандуючы ВПС РФ генерал-палкоўнік Аляксандр Зелін, у баявы склад адзінай сістэмы СПА ўвойдуць пяць авіяцыйных часцей, дзесяць зенітна-ракетных часцей, пяць радыётэхнічных часцей і адна часць радыёэлектроннай барацьбы. Паводле яго слоў, сістэму ўзначаліць камандуючы аб’яднаннем ВПС і СПА аднаго з бакоў. Пры гэтым, як сказаў А. Зелін, ён будзе прызначацца на пасаду прэзідэнтамі дзвюх дзяржаў.

Разам з тым памочнік Мядзведзева Сяргей Прыходзька паведаміў, што Расія гатовая прадставіць Беларусі некалькі дзесяткаў мільярдаў рублёў крэдыту дадаткова. Віцэ-прэм’ер Аляксей Кудрын удакладніў: 100 мільярдаў рублёў. Гэта тыя грошы, якія Лукашэнка прасіў для пераходу ва ўзаемным гандлі на адзіную валюту. Хаця яшчэ тыдзень таму міністр фінансаў РФ Дзмітрый Панкін гаварыў, што пытанне выдачы крэдыту нават не разглядаецца.

Людзі, якія лічаць Расію дагэтуль “імперскай” і вартай таго, каб апасацца, што яна “праглыне” Беларусь, мяркуюць, што Расія нацiснула на Беларусь, і Аляксандр Лукашэнка “прадаў ёй сваё неба”. Аднак ці ёсць тут хоць крыху праўды, акрамя русафобіі?

Па-першае, Расія гатова выдаць крэдыт ужо зараз. А пагадненне пра стварэнне адзінай аб’яднанай сістэмы СПА дзвюх краін павінны разгледзець і ратыфікаваць два парламенты: беларускі і расійскі. Калі расійскі можа зрабіць гэта хутка, то беларускі пачне сваю працу толькі 2 красавіка. А за гэты час шмат што можа змяніцца. Прынамсі, можна расійскі крэдыт праесці.

Па-другое, спадар Лукашэнка дадаткова можа кідаць шпількі ў бок Расіі і казаць, што мы нічога Расіі не павінны, бо яны не плацяць за свае вайсковыя аб’екты. А можа нават запатрабаваць у Расіі плату за іх.

Па-трэцяе, беларускі бок аўтаматам можа адмяніць пытанне прызнання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ў якасці незалежных рэспублік. Калі раней казалася, што гэтае прызнанне ёсць неабходнай умовай выдачы крэдыту, то зараз яно змянілася на супрацьпаветраную абарону.

А тое, што ў інтэрв’ю кіраўніка Паўднёвай Асеціі Эдуарда Какойты расійскай “Камсамольскай праўдзе” распавядалася пра “абяцанне Аляксандра Лукашэнкі” прызнаць незалежнасць самаабвешчаных грузінскіх тэрыторый, дык раней жа тлумачылі Какойце — рашэнне будзе прымаць парламент. І неістотна, што гэты парламент прымае тыя рашэнні, якія яму дазволена прыняць “*з высочайшего соизволения*”. Аляксандр Лукашэнка потым змога развесці рукамі і сказаць Какойце: “Ну, незалежная ў нас заканадаўчая ўлада ад выканаўчай. Не магу нічога зрабіць!” І фармальна будзе мець рацыю.

А тое, што расійскі крэдыт скіраваны на ўвядзенне рубля Расіі ў якасці адзінай валюты — гэта ўвогуле з галіны фантастыкі. Хаця б таму, што Беларускі рубель у працэсе дэвальвацыі абясцэніўся на 25%, а расійскі за перыяд крызісу — на 60%. “Навошта нам нестабільны расійскі рубель, калі наш — стабільнейшы”, — гэтую рыторыку ад Лукашэнкі мы чулі і падчас іншых абмеркаванняў па пытанні ўвядзення адзінай валюты. Дый, калі верыць планам і пагадненням, адзіная валюта павінна была быць у нас пяць год таму.

Тым больш, што міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў абверг паведамленні пра прыняцце на пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы 3 лютага плана па ўвядзенні адзінай валюты Беларусі і Расіі.

І не варта енчыць, што “байцу 29-й зенітна-ракетнай брыгады Івану Шылу, магчыма, давядзецца збіваць самалёты “ворагаў Расіі”. У Расіі папросту няма такіх ворагаў, каб яны лёталі на яе з бамбёжкамі.

Але, калі спусціцца ўніз з гор высокай палітыкі, можна сказаць, што ў Беларусі жыццё ідзе сваім шляхам. Апазіцыя, традыцыйна, за паўтары месяцы пачала падрыхтоўку да Дня Волі 25 сакавіка. Традыцыйна ж заяўнікам акцыі стала Партыя БНФ. Традыцыйна намеснік старшыні гэтай партыі сцвярджае, што будзе створаны шырокі аргкамітэт па святкаванню гэтага дзня і што дэманстранты не збіраюцца ісці на Бангалор. Мінулым годам такія заявы скончыліся масавай “зачысткай” дэманстрантаў. Але ў той час не было абвешчана пра “лібералізацыю”, “дэмакратызацыю” і “збліжэнне з Захадам”.

Тым часам улады імкнуцца зрабіць добрую міну пры дрэннай гульні. Заяўлена пра стварэнне разнастайных грамадскіх саветаў пры міністэрствах і Адміністрацыі прэзідэнта. А журналістаў, якія заклапочаныя ўступленнем у дзеянне з 8 лютага новага закона аб СМІ, паспрабавала пераканаць у ягонай бясшкоднасці сама Наталля Пяткевіч.

“Новы закон аб СМІ не нацэлены на “зачыстку” медыйнай прасторы Беларусі. Такая мэта не стаяла і не будзе стаяць”, — заявіла спадарыня Пяткевіч на пасяджэнні “круглага стала”, што праходзіў 4 лютага ў Мінску з удзелам прадстаўнікоў беларускіх уладаў і міжнародных арганізацый. Яркім прыкладам адсутнасці мэты “зачысткі” інфармацыйнай прасторы Н. Пяткевіч назвала паведамляльны парадак рэгістрацыі СМІ. Акрамя таго, паводле яе слоў, у адпаведнасці з указам прэзідэнта пры перарэгістрацыі не будзе збірацца дзяржаўная пошліна. “Апанентам закона я магу сказаць: пачакайце, самае галоўнае — як закон будзе рэалізоўвацца на практыцы”, — зазначыла Пяткевіч.

У тым уся і справа, што ў нашых умовах рэалізацыя на практыцы нават самых лепшых законаў насамрэч аказвалася такой “засадай”, што ад яе стагналі ўсе — і журналісты, і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, і самі чыноўнікі. Што будзе з гэтым законам, баюся, журналісты змогуць пабачыць толькі ў чарговых судах.

А, як паказала практыка, штрафы для газет — завоблачныя.

З НАГОДЫ

# АЛЯКСАНДР ПАТУПА: ПРЫ ПЭЎНЫХ УМОВАХ ГРАМАДСКА-КАНСУЛЬТАЦЫЙНАЯ РАДА МОЖА ПРЫНЕСЦІ СТАНОЎЧЫЯ ВЫНІКІ

**Адным з тых, хто атрымаў запрашэнне ўзяць удзел у працы грамадска-кансультацыйнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі, з'яўляецца ганаровы старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў прафесар Аляксандр Патупа. Свае меркаванні наконт задач і перспектыў дзейнасці новай структуры ён выказаў у размове з карэспандэнтам "НЧ" Генадзем Кеснерам.**

*— Якой вы бачыце грамадска-кансультацыйную раду?*

— Паводле маіх уяўленняў, гэта пэўная экспертная група, якая падбіралася па персанальнай прыкмеце. Сёння, я лічу, нейкі "круглы стол" з удзелам партый, грамадскіх арганізацый — апазіцыйных ці прапрэзідэнцкіх — скрайне неэфектыўны. Гэта было б папросту гублянне часу, для гэтага яшчэ трэба ствараць сітуацыю, і сітуацыя павінна стварацца менавіта за кошт экспертных груп. Калі гэта будзе насамрэч так, то ёсць шанс дабіцца станоўчага выніку.

Больш за тое, экспертная група зручная ў тым сэнсе, што не так крыўдна, калі праігнаравалі нейкую партыю ці арганізацыю. Адбор экспертаў — гэта, як кажуць, пытанне таго, хто замаўляе. А другі зручны момант, што адмыслоўцаў заўжды можна прыцягваць. Урэшце распараджэнне спадара Макея (кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта — Г. К.), якое падпісана, можна потым падпісаць наноў, увесці дадатковых людзей, запрасіць новых экспертаў. Іншымі словамі, выпрацоўваць аптымальны склад значна прасцей. Для гэтага не спатрэбіцца цяжкі механізм нейкіх партыйных галасаванняў. Скажу шчыра: калі б гаворка ішла пра нейкае фарміраванне кшталту "круглага стала", я зусім не ўпэўнены, што пагадзіўся б на такое дарэмнае гублянне часу. У дадзеным выпадку, магчыма, будзе карысць.

*— Чым рада павінна заняцца ў першую чаргу?*

— Найперш там трэба абмеркаваць метадалагічныя моманты. Эканомячы на гэтым першыя гадзіны працы любой структуры, мы потым нясем велізарныя страты. У свой час два ці тры разы была збітая агромністая праца знакамітай Групы па адміністрацыйных працэдурах, бо не дамовіліся па метадалогіі, што лічыць добрай працэдурай, а што трэба скасаваць. З-за гэтага вялікая колькасць пасяджэнняў прайшла ўпустую, а тут рызыка яшчэ большая, таму адразу трэба дамовіцца пра прынцыпы работы.

На мой погляд, прынцыпы павінны быць дастаткова простыя. Усё мусіць цесна засяродзіцца вакол трох асноўных кірункаў. Па-першае, было б добра, каб рада мела магчымасць разглядаць тыя праекты нарматыўных і прававых актаў, па меншай меры, сур'ёзных, значных, якія рыхтуе ўлада, выказваць свае заўвагі, рэкамендацыі, пажаданні.

Другі момант: ёсць дзеючыя законы, падзаконныя акты, указы, дэкрэты і шмат чаго іншага. Я думаю, што і ўлада можа раіцца, але са свайго боку і мы можам вылучаць прапановы па іх змяненню, часам вельмі істотнаму, паколькі ў нашым заканадаўстве ёсць шмат чаго дастаткова негатыўнага, што варта было б скасаваць.

І трэці момант — гэта прапанова тых ці іншых праектаў з экспертнага боку з тым, каб яны рэальна былі разгледжаны. А ў нашых умовах рэальна гэта можа адбывацца толькі пры падтрымцы Адміністрацыі прэзідэнта, якая здольная даць каманду тым ці іншым міністэрствам папярэдне нашы прапановы прапрацоўваць і рабіць праекты ўказаў, дэкрэтаў... Гэта таксама вельмі сур'ёзная і неабходная ўмова.

На мой погляд, кожны з сябраў экспертнай рады мусіць мець магчымасць незалежна вылучаць ініцыятывы па праектах нейкіх актаў. Той праект, які хацеў бы прадставіць нехта з экспертаў ці група экспертаў, было б вельмі важна абмеркаваць: па-першае, адкрыюцца новыя рысы, а па-другое, і дзяржаўны бок зможа ацаніць грамадскую рэакцыю на папярэднія прапановы або нейкія дэталі, што патрабуюць удакладнення. Тады гэта мае сэнс.

*— Чаго варта чакаць ад дзейнасці новай структуры?*

— Я думаю, што такі падыход, канешне, прынясе істотную ачышчальную карысць нашаму заканадаўству, але тут вельмі важная стратэгічная карысць, таму што тады ўлада зможа абсалютна шчыра сказаць: створана структура, якая ажыццяўляе, хоць і ў абмежаванай ступені, кантрольна-карэкціровачныя функцыі.

Справа ў тым, што наша ўказна-дэкрэтнае заканадаўства, якое ў свой час бачылі бы прымалася выключна для надзвычайных абставін, надзвычайных захадаў, насамрэч замацавалася як сталае, рэгулярнае. Гэта вельмі зручна для ўлады.

Сапраўды, практычна не засталося кантрольных інстанцый над прэзідэнцкай галіной улады. Парламент зарыентаваны зусім інакш, там знаходзяцца людзі, якія па сутнасці не з'яўляюцца палітыкамі. На гэтай падставе маглі б сфарміравацца ўмовы для сапраўды шырокага дыялога. Па-другое, людзі ўцягнуліся б у такую кантрольна-карэкціровачную дзейнасць, а гэта ўжо сур'ёзнае ўзаемадзеянне з дзяржавай, і потым яно магло б даць новыя фармулёўкі таго, што мы разумеем пад парламентам, а магчыма, дазволіла б нават прыйсці да нейкай іншай мадэлі выбараў.



Я хачу падкрэсліць, што працаваць з праектамі нарматыўна-прававых актаў — гэта зусім не з лозунгамі, тое вельмі сур'ёзная рэч. Я мяркую, што з боку экспертаў маглі б быць рэкамендацыі па дасведчаных людзях, якія б маглі ўвайсці ў выканаўчую ўладу на сур'ёзныя пазіцыі. То бок, гэта ўжо сапраўды добрая перспектыва, каб казаць пра дэмакратызацыю і лібералізацыю ўсяго працэсу ў краіне, але, канешне, пры ўмове, што ўлады змогуць прыняць гэтыя правілы гульні.

МЕРКАВАННІ

# ЗЯНОН ПАЗЬНЯК: ТРЭБА РАТАВАЦЬ НАЦЫЮ, А НЕ РЭЖЫМ

**Калабарацыяй назваў Зянон Пазьняк згоду некаторых беларускіх палітыкаў і адмыслоўцаў прыняць удзел у працы розных кансультацыйных радаў, створаных уладамі краіны. У інтэрв'ю "Польскаму радыё" старшыня Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі пракаментаваў "кадравыя прапановы" ўладаў апазіцыі.**



*— Як Вы лічыце, чаму ўлада вырашыла запрасіць прадстаўнікоў некаторых палітычных партый і незалежных арганізацый у створаныя ёю кансультацыйныя рады?*

— Гэта стандартныя хады любой дыктатуры, якая трапляе ў нязручнае становішча. Тое самае рабіў і Пуцін, і іншыя. Гэта вядомы механізм. Крызіс небяспечны ў першую чаргу для ўлады. У час крызісу яна можа перакуліцца. Зараз улада хоча сябе ратаваць і робіць стандартныя хады, ужо правераныя здаўна. Што датычыць тых людзей, якія быццам бы займаліся палітыкай, то з палітычнага пункту гледжання — гэта поўная бязглуздзіца. Гэта нонсенс! Гэта калабарацыя. Пайсці ратаваць гэты рэжым, які хоча іх выкарыстаць, каб зрабіць сабе перад Захадам добры імідж! Трэба ратаваць нацыю, а не рэжым. Мяне здзіўляе тое, што ніхто нават не задаваў пытанняў: што гэта за рады і якія ў іх статуты, якая магчымасць і дзе яны будуць? Ніхто не задаваў пытанняў, акрамя аднаго чалавека, Алега Трусава, які паставіў умову: каб усё было па-беларуску. А астатнія з радасцю ідуць супрацоўнічаць з рэжымам, не вымагаючы ніякіх умоў.

*— Некаторыя з запрошаных бачаць у гэтым магчымасць ратавання краіны ад наступстваў крызісу.*

— Крызіс — гэта ў першую чаргу цяжкае аднаўленне. Крызіс заўсёды павінен прыводзіць да пераменаў, да аднаўлення сітуацыі. І вельмі важна ў час крызісу, каб палітычныя сілы дзейнічалі адэкватна. Крызіс трэба выкарыстаць, каб ліквідаваць гэты рэжым, каб выставіць палітычныя абвінавачанні. Таму што вінаваты ў ім рэжым. Задача палітычных сілаў у гэты перыяд — выкарыстаць крызіс, каб ліквідаваць рэжым, каб змяніць і аднавіць уладу, каб аднавіць дзяржаўныя адносіны.

*— Але змагаючыся з уладай у такіх умовах можна беспаваротна страціць дзяржаву, яе эканоміку, а можа нават і суверэнітэт.*

— Пакуль будзе гэты рэжым, да таго часу будуць душыць гэты народ, як і душылі раней. За кошт народу будуць старацца калі не выйсці з гэтага крызісу, дык хоць прынамсі неяк плаваць на паверхні. І яны ўжо некалькі месяцаў робяць гэтыя касметычныя захады, а вынікаў ніякіх. І не можа быць вынікаў. Трэба дапамагаць адраджэнню пратэстных настрояў. Пакуль іх не будзе, да гэтага часу не адбудзецца ніякіх перамен. Рэжым будзе людзей душыць, а людзі будуць маўчаць. Таму першым крокам беларускіх палітычных партый павінна быць інфармацыя, асвета і дапамога ў адраджэнні пратэстных настрояў у грамадстве. Каб людзі разумелі, хто вінаваты ў гэтай бядзе, хто вінаваты ў крызісе на Беларусі.

*— Магчыма, некаторыя палітыкі хочуць выкарыстаць гэтае запрашэнне дзеля таго, каб улада пайшла на саступкі і ўсё ж правяла змены ў краіне?*

— Я вам прывяду фігуральны прыклад: вы ідзяце ноччу па вуліцы і бачыце, што злодзей рабуюць банк. Да вас падскокваюць і кажуць: "Слухай, хлопец, ты тут пастой і папільнуй, каб міліцыя не ехала. Папярэдзь нас". Якое гэта супрацоўніцтва? Гэта проста абсурд! Так не можна выкарыстаць дыктатуры, таму што яны не маюць ніякай улады, не ставілі абсалютна ніякіх умоваў. Нават не ведаюць, чым яны будуць займацца. Яны прадэманстравалі сваю нікчэмнасць і гатоўнасць ісці на любыя ўмовы, на любую працу, каб супрацоўнічаць з рэжымам.

*— Нядаўна Аляксандра Лукашэнка зацвердзіў гэтак званы "пакет па лібералізацыі эканомікі", які ўтрымлівае мноства палёгкаў для вядзення ў краіне бізнесу. Як Вы яго ацэньваеце?*

— Гэта ўсё маленькія паказушныя хады, якія ў любы час могуць быць адменены. Таму што няма грунтоўнай пераробкі, дый не можа быць, пакуль будзе гэтая ўлада. Дыктатура робіць такія хады для таго, каб паказаць, што нешта быццам бы робіцца. Але ў сутнасці гэта не закранае глыбінных працэсаў, не закранае таго выхаду, таго шляху, пры дапамозе якога можна выйсці з крызісу. Унутраная палітыка ў прынцыпе не мяняецца (і мы гэта добра бачым): ні ў эканоміцы, ні ў культуры. Не мяняецца таксама міжнародная палітыка. Ідзе дэмагогія, кіўкі ў бок Масквы, у бок Брусэля. Спадзяванне, што можна неяк выплысці на гэтай сітуацыі, узяўшы крэдыты, пагуляўшы трошкі з Масквою. Яны не маюць канкрэтнага плану. Яны не ведаюць, што будзе і колькі прадоўжыцца гэты крызіс.

**— Брусель хваліць Беларусь за першыя змены і сцвярджае, што Мінск ідзе ў правільным накірунку.**

— Еўрасаюз праводзіць у сваіх інтарэсах сваю геапалітыку. Дэмакратыя была сродкам гэтай палітыкі. Калі яны ўбачылі, што іх крэатура над Беларуссю ні на што не здольная, то пакінулі ўсе размовы пра правы чалавека, пра дэмакратыю і пачалі непасрэдна супрацоўнічаць з рэжымам. У справе гэтых жа праблемаў: праблемаў геапалітычных і энергетычных. А ўсё астатняе — гэта ўмоўнасць. Еўропа мысліць зусім другімі катэгорыямі. Дэмакратыя — гэта сродак для дасягнення іх палітыкі. Як толькі гэты сродак перастаў дзейнічаць, яны яго адкінулі. Гэта прадэманстравалі Чачня, Блізкі Усход і таксама Беларусь.

АКЦЫЯ

# МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ...

Вольга Хвоін

**Дзень Волі сёлета плануецца адзначыць шэсцем у Мінску па галоўным праспекце ад Акадэміі навук да Кастрычніцкай плошчы. Заяўку на правядзенне акцыі за подпісамі кіраўнікоў Партыі БНФ ужо перадалі ў Мінгарвыканкам. У дакуменце абачліва пазначана, каб чыноўнікі не прапаноўвалі ў якасці альтэрнатывы шэсцю па праспекце Незалежнасці маршрут на плошчу Бангалор. Калі ж дазволу на шэсце па праспекце не будзе, то намеснік старшыні партыі БНФ Віктар Івашкевіч паабяцаў "ісці да ачаплення" на Кастрычніцкую плошчу.**



Дзень Волі – 2008

Заяўнікі акцыі — кіраўнік партыі БНФ Лявон Баршчэўскі і яго намеснікі Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч, Аляксей Янукевіч — бяруць на сябе юрыдычную і арганізацыйную адказнасць, але адкрытыя да супрацоўніцтва з іншымі суб'ектамі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, прафсаюзамі, прадпрымальнікамі.

Дзень Волі, па словах арганізатараў акцыі, упісваецца ў план святкавання дваццацігоддзя партыі БНФ. Але святочны настрой збіваюць нярадасныя весткі з прадпрыемстваў краіны ды справаздачы Міністэрства статыстыкі пра тое, што паказчыкі эканамічнага росквіту "едуць" уніз. Таму Дзень Волі вырашана правесці пад лозунгамі "За праўду! За справядлівасць! За свабоду!".

Намеснік старшыні партыі БНФ Віктар Івашкевіч зачытаў журналістам адпаведнае пасланне: "Цяпер ужо вядома, як змяніўся стан асабістых рублёвых і валютных рахункаў беларускіх урадаўцаў у перыяд за два тыдні дэвальвацыі. У той жа час урад не збіраецца нікому кампенсаваць страты банкаўскіх укладаў (у тым ліку і пенсіянерам). Мы рашуча выступаем супраць планаў уладаў перакласці ўвесь цяжар крызісу на плечы простых людзей. Таму мы патрабуем: штоквартальна падвышаць заробкі і пенсіі адпаведна росту кошту спажывецкага кошыка, выплачваць паўгадавыя выходныя кампенсацыі асобам, што звальняюцца з працы без іх віны, рэальна спрасціць рэгістрацыю, ліквідаваць усе перашкоды і абмежаванні для дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў і малых прадпрыемстваў".

БНФ патрабуе радыкальных пераменаў, у прыватнасці адстаўкі кіраўніцтва краіны. "Мы заяўляем, што ў Беларусі галоўнай пагрозай незалежнасці з'яўляецца рэжым асабістай улады Лукашэнкі, менавіта ён адказны за глыбіню гэтага крызісу, што ахоплівае Беларусь. Таму мы патрабуем сыходу Аляксандра Лукашэнкі ў адстаўку, правядзення новых свабодных выбараў парламента і прэзідэнта Беларусі, стварэння ўраду народнага даверу, які возьме на сябе рэалізацыю распрацаваных ім канкрэтных шляхоў пераадолення сістэмнага крызісу, у якім апынулася Беларусь", — заявіў Віктар Івашкевіч.

Намеснік старшыні партыі БНФ Вінцук Вячорка адзначыў, што ўжо цяпер можна зрабіць высновы, што кіраўніцтва Беларусі не справілася з "хатнім заданнем" Еўрасаюзу. На вялікі жаль, выпрабавальны перыяд, які заканчваецца 13 красавіка, папярэдне можна ацаніць негатыўна, як перыяд страчаных шанцаў. Не было зроблена ніякіх спробаў для інстытуцыянальных захадаў, найперш зменаў у заканадаўстве. І за гэты час, што застаўся, іх зрабіць (ці хоць распачаць) папросту немагчыма. Інтэнсіўнае будаўніцтва "макееўскіх ці пяткевічаўскіх вёсак" у выглядзе розных рад, якія да болю нагадваюць расійскую грамадскую палату, гаворыць пра пэўны абмен паміж мядзведзеўскай Расіяй і лукашэнкаўскай Беларуссю. Гэтыя рады не маюць рэальных паўнамоцтваў, а толькі іміджмейкерскую нагрузку. Цяперашні рэжым Беларусі цалкам сумяшчальны з рэжымам Расіі, але ніяк не з еўрапейскімі падыходамі".



Photo.ByMedia.Net

Палітыкі не маюць пярэчанняў да ўдзелу ў акцыі прадпрымальнікаў. Хаця раней заява лідэра кампаніі "За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва" Віктара Гарбачова пра намер правесці 25 сакавіка ў Мінску Марш падманутых і непачутых выклікала рэзкую крытыку з боку палітыкаў правага крыла апазіцыі. "Нас пачалі крытыкаваць за назву, за фармат. Але я не прапаноўваў дзяліцца, я наадварот прасіў насельніцтва падтрымаць гэтую акцыю. Для кожнага свае разуменне Дня Волі, і чым больш мы будзем звужваць кола патэнцыйных удзельнікаў, тым менш людзей прыйдзе, — тлумачыць сваю пазіцыю Віктар Гарбачоў. — Дзяленне на нацыянальна свядомых і "несвядомых" адчужае актыўную частку насельніцтва. Нягледзячы на ўсе пратэсты, мы прынялі рашэнне ўсё роўна ўдзельнічаць у шэсці, толькі змянілі назву сваёй акцыі. Гэта будзе марш вольных, свабодных прадпрымальнікаў. Хто яшчэ адчувае сябе свабодным, калі ласка, прыходзьце. Хадзіць асобнымі калонамі таксама не збіраемся, бо гэта было б па-дурному і непрыгожа. Час дзяліцца ўжо прайшоў. Мы будзем з імі, а яны з намі. І не павінна там быць гарбачовых ці івашкевічаў, павінна быць адзінства".

Лідэр прадпрымальніцкага руху паведаміў, што цяпер ідзе збор подпісаў за тое, каб арэндныя выплаты і падаткі не былі прывязаныя да еўра. "Мы маем беларускае кіраўніцтва, беларускія законы, то чаму не паважаем сваю валюту? Нашы выплаты не павінны залежаць ад валюты іншых дзяржаў", — адзначае Віктар Гарбачоў. На Дзень Волі прадпрымальнікі збіраюцца перадаць сабраныя подпісы ў Адміністрацыю прэзідэнта і парламент.

Сёлета Дзень Волі, па задуме арганізатараў, найперш мусіць мець пратэстны характар. Крэатыўныя прапановы па правядзенню акцыі заяўнікі спадзяюцца атрымаць ад сваіх калег з палітычных, прадпрымальніцкіх і грамадскіх колаў.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ВЕРТЫКАЛЬ НЕ ГАТОВАЯ ДА ДЫЯЛОГУ

Марыя Крук



**Яраслаў Раманчук адмовіўся ўдзельнічаць у наступных пасяджэннях групы, што распрацоўвае план дзеянняў па развіцці краінавага маркетынгу Беларусі.**

Міжведамасная камісія пад кіраўніцтвам намесніка міністра замежных справаў Андрэя Яўдачэнкі, куды ўключылі незалежных экспертаў — дырэктара лабараторыі "Новак" Андрэя Вардамацкага і кіраўніка Навукова-даследчага цэнтра Мізеса Яраслава Раманчука, — была створана 31 снежня 2008 года. Праз месяц працы ў камісіі Яраслаў Раманчук прыйшоў да высновы, што наяўнасць у ёй альтэрнатыўных чыноўнікам экспертаў насамрэч не патрэбная.

"Я на сабе адчуў, што вертыкаль не гатовая да канструктыўнага дыялогу, не гатовая да дыялогу ўвогуле, — заявіў Яраслаў Раманчук. — Відавочна, акцэнт быў зроблены на тое, што мы папросту нічога не падрыхтуем, скажам, што грошы не плацяць, таму мы нічога і не робім. Але калі Міністэрства замежных справаў прапанавала свой план, мы за суткі падрыхтавалі свае напрацоўкі. У канчатковым плане МЗС нічога з нашых прапаноў не было ўлічана".

У падрыхтаваным Раманчуком, Вардамацкім і іншымі экспертамі плане дзеянняў звяртаецца ўвага на тое, што краінавы маркетынг — гэта не лабізм пэўных прадпрыемстваў і тавараў, не падмена маркетынгавых дзеянняў дзяржаўных або прыватных кампаній. З улікам паглыблення крызісных з'яваў у сусветнай эканоміцы і іх уплыву на эканоміку Беларусі, а таксама вышэйпералічаных асаблівасцяў, краінавы маркетынг Беларусі павінен быць маркетынгам карэкцыі негатыўных момантаў знешняга іміджу краіны.

На пасяджэнні камісіі 26 студзеня Яўдачэнка прадставіў свой праект плану краінавага маркетынгу. Паводле слоў Раманчука, дакумент мае шэраг сур'ёзных недахопаў, якія робяць працу па эфектыўным краінавым маркетынгу немагчымай. Не падаўшы пераканаўчых аргументаў на карысць свайго праекту, Яўдачэнка прапанаваў занесці свае прапановы ад імя ўсёй групы.

Сваімі высновамі пра працу камісіі Яраслаў Раманчук падзяліўся з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім і намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Наталляй Пяткевіч — дзяржслужбоўцам былі накіраваны адпаведныя лісты.

"За ўвесь час працы камісіі яе старшыня Яўдачэнка правёў толькі два пасяджэнні, — гаворыцца ў лісце. — Першае было азнаямляльным. Не была забяспечаная сувязь і інфармацыйны абмен паміж сябрамі групы. Не быў зацверджаны рэгламент працы і прыняцця рашэнняў. Мая просьба падаць кантактную інфармацыю ўсіх сябраў групы была адхіленая. Мною і яшчэ чатырма маімі калегамі з дадзенай камісіі ў МЗС была падрыхтаваная канцэпцыя прапанаванага дакумента. За гэты час не было распачата ніводнай спробы абмеркаваць нашы прапановы".

"З прынцыповых меркаванняў я на Яўдачэнку ніколі не працаваў і працаваць не буду, — заявіў кіраўнік Навукова-даследчага цэнтра Мізеса Яраслаў Раманчук. — Абсурднасць сітуацыі ў тым, што МЗС збіраецца прапаноўваць канцэпцыю краінавага маркетынгу пад структуру, якая яшчэ практычна не створаная і мандат якой не зацверджаны. Та бок нацыянальнае інвестыцыйнае агенцтва, якое ў нас існуе, мусіць кіраваць і прыватызацыяй, і інвестыцыямі, і ўсім-усім. Як можна ствараць канцэпцыю пад неіснуючую арганізацыю, як рабіць план пад канцэпцыю, якой няма, я таксама не ведаю. Таму я не бачу сэнсу знаходжання ў гэтай камісіі. Калі ўлады так бачаць супрацоўніцтва з незалежнай экспертнай супольнасцю, то натуральна, што гэта прафанацыя, галачка і нічога больш".

Спробы нешта змяніць у краіне эксперт назваў "першым блінам, які выйшаў камяком". Яраслаў Раманчук лічыць, што ў Беларусі засталося каля трох месяцаў часу, пасля давядзецца прымаць "сур'ёзныя рашэнні". "Мы адкрытыя для дыялогу ў імя Беларусі, а не ў імя Яўдачэнкі, Лукашэнкі ці Сідорскага", — падкрэсліў Яраслаў Раманчук.

**Даведка:** краінавы маркетынг — гэта комплекс аналітычных і практычных мерапрыемстваў па прасоўванні эканамічнага і інвестыцыйнага патэнцыялу краіны, яе адміністрацыйна-прававых, інфраструктурных і прыродных пераваг для прыцягнення інвестыцый і інтэграцыі камерцыйных і грамадскіх арганізацый у міжнародныя працэсы, паўнавартаснага ўдзелу ў працы міжнародных рынкаў, арганізацый і інстытутаў.

▸ ВЫЖЫВАННЕ

# АБЫВАЦЕЛЬ У ВАРУНКАХ КРЫЗІСУ

Вольга Хвоін

**Пра эканамічны крызіс не чуў хіба толькі глухі. Яго абмяркоўваюць у грамадскім транспарце, студэнцкіх калідорах, кабінетах чыноўнікаў, у сталоўках і рэстарацыях. Пару месяцаў таму ўсе дыскусіі зводзіліся збольшага да тэарэтычных пасажаў кшталту "а ў Амерыцы, Расіі...". Цяпер у размовах перайшлі ад тэорыі да практыкі: амаль у кожнага ёсць знаёмыя, якім падрэзалі заробак, скарацілі працоўны тыдзень ці звольнілі ўвогуле.**



## Перасыхаюць крыніцы даходаў

Беларускія прадпрыемствы змагаюцца з крызісам метадам скарачэння колькасці працоўных дзён. Прамысловы гігант, Мінскі аўтазавод, пачынае працаваць — тры дні ў тыдзень. Падобную стратэгію абралі для сябе і прадпрыемствы, звязаныя з інфармацыйнымі тэхналогіямі: НДІ ЭВМ і ЗАТ "НПП Белсофт".

Як паведамляе сайт "Хартыя–97", з 2 лютага МАЗ перайшоў на трохдзённы працоўны тыдзень: 2, 6, 9, 13, 16, 20, 23, 27 лютага абвешчаны прастой, людзям у гэты час будуць выплачваць 2/3 заробку. Старшыня прафкама Мінскай гарадской першаснай прафсаюзнай арганізацыі, якая ўваходзіць у склад прафсаюза РЭП, Уладзімір Лазоўскі абнародаваў інфармацыю, што рабочыя МАЗа не будуць працаваць па панядзелках і пятніцах. Пакуль "на плыву" застаецца толькі вытворчасць аўтобусаў. «На прадпрыемстве і так ужо адбылося скарачэнне заробку, людзі страцілі ад 200 да 500 тысяч рублёў у сувязі з тым, што працуюць у рэжыме няпоўнага часу, абмежаваныя розныя даплаты, прэміі. Зарплата была 1 мільён 300–400 тысяч. Зараз — ад 800 тысяч да 1 мільёна 200 тысяч рублёў. І гэта не мяжа, заробкі будуць яшчэ больш скарачацца», — цытуе Лазоўскага інтэрнэт-рэсурс.

Супрацоўнікам буйнейшага беларускага прадпрыемства, якое працуе ў галіне інфармацыйных тэхналогій, ЗАТ "НВП Белсофт" паведамілі, што з першага лютага "на прадпрыемстве абвешчанае прыпыненне работы (прастой) на тэрмін да першага сакавіка 2009 года. У перыяд прастою працаўніку гарантуецца аплата ў памеры двух трацін тарыфнай стаўкі (акладу). У перыяд прастою працаўнік павінен выконваць рэжым працоўнага часу, устаноўлены працоўнай дамовай". На іншым прадпрыемстве з той жа галіны — НДІ ЭВМ — таксама пераводзяць супрацоўнікаў на трохдзённы працоўны тыдзень.

## Не да жыру, быць бы жывым

Цягам аднаго месяца для многіх беларусаў стала рэальнасцю тое, што ў мінулым годзе падавалася фантазіяй і кашмарам з выпускаў навін. Шматлікія



прадпрыемствы ўсімі магчымымі спосабамі імкнуцца скараціць штат ці ўрэзаць сваім супрацоўнікам заробкі. Калі на дзяржаўных прадпрыемствах кіраўніцтва пакуль імкнецца пазбегнуць прамых скарачэнняў, то на прыватных, а тым больш калі наёмны рабочы працуе неафіцыйна, сітуацыя зусім іншая.

На днях знаёмую, якая працавала гандляркаю на адным з рынкаў, фактычна паставілі перад выбарам — звальняцца ці працаваць за маленькі заробак. Сума заробку ў Наталлі вылічвалася ў працэнтах ад выручкі, з новага года абароты продажу скараціліся ўдвая, дадаткова гаспадар у два разы скараціў працэнт, па якім вылічваўся заробак. Атрымліваецца, што на працягу месяца даход Наталлі скараціўся ў чатыры разы.

"Я збіралася паехаць летам на адпачынак, паступіць на завочнае ва універсітэт, — расказвае гандлярка. — А атрымалася так, што я мушу шукаць новую працу, гэта цяпер няпроста. Ад адпачынку хутчэй за ўсё давядзецца адмовіцца, бо навучанне усё ж



больш важнае". У іншым прыватным прадпрыемстве заробак у капэртах выплачваецца ў эквіваленце да долара. Пасля студзеньскай дэвальвацыі кіраўнік фірмы паведаміў супрацоўнікам, што цяпер заробак яны будуць атрымліваць у беларускіх рублях у пераліку на курс долара 2 200 рублёў. І так аж да лета. На заўвагі, што такі курс можна было бачыць толькі летась, кіраўнік адказаў прыблізна наступнае: "Калі вам плаціць па сапраўднаму курсу, то мне нічога не застанецца". Натуральна, пры такіх умовах заробак супрацоўнікаў аўтаматычна дэвальваваўся разам з беларускім рублём.

Калі на пачатку студзеня крамы былі ахопленыя ажыятажным наплывам пакупнікоў, то цяпер шал спаў, і гандляры задумаліся, якія яны атрымаюць заробкі, калі выручка мінімальная. Натуральна, найперш спад спажывецкага попыту адчуваюць гандляры тавараў, якія не адносяцца да катэгорыі першай неабходнасці — вопратка, абутак, спартыўны інвентар і г. д. У прадуктовых крамах кошыкі наведвальнікаў заўважна паменшалі: найперш набываецца самае неабходнае.

Найбольш яскрава гэта бачна па пакупках пенсіянераў. (Паводле дадзеных камітэта статыстыкі, сярэдні памер працоўнай пенсіі ў лістападзе мінулага года склаў 394 147 беларускіх рублёў, пенсіі па ўзросту — 40 8327 рублёў. Урад Беларусі пакуль ніякіх намераў па кампенсацыі пенсій-стыпендыйзаробкаў у сувязі з дэвальвацыяй не агучваў.) Нэлі Мікалаеўна расказала, што раней працавала ў канструктарскім бюро. Цяпер яе пенсіі хапае толькі на аплату камунальных паслуг і мінімум харчавання: "Я на ўсім імкнуся эканоміць. Набываю для супоў косткі, субпрадукты, нейкія крупы. Але ўсё роўна атрымліваецца дорага. З рэчаў амаль нічога не набываю. Хіба толькі калі зусім неабходна, то нешта з вопраткі і абутку".

Па звестках таго ж Нацыянальнага статыстычнага камітэта, налічаная сярэдняя заработная плата працаўнікоў Беларусі ў



снежні 2008 года склала 1000187 рублёў, працоўных і службоўцаў — 1020299 рублёў. Нават калі ўявіць, што заробкі не сталі меншымі (а такіх сфер вельмі мала), то атрымліваецца, што з новага года іх рэальны памер паменшыўся больш чым на 20 працэнтаў, і прыкладна на столькі ж, а на некаторыя групы тавараў і больш, падскочылі цэны. І хаця на пачатку снежня намеснік міністра эканомікі Беларусі Уладзімір Адашкевіч запэўніваў, што ў 2009 годзе індэкс спажывецкіх коштаў у Беларусі не перавысіць 9–11 працэнтаў, ужо цяпер бачна, што рэальнасць запланаваныя паказчыкі дагоніць і перагоніць.

Між іншым, нядаўна намесніца міністра эканомікі Таццяна Старчанка ў інтэрв'ю газеце «Рэспубліка» паведаміла, што падвышаць тарыфную стаўку першага разраду для арганізацый, якія выкарыстоўваюць дзяржаўныя датацыі, у першым квартале 2009 года не плануецца. І нават невялікі рост заробкаў будзе магчымы толькі з улікам фінансавых магчымасцяў дзяржавы. «У адпаведнасці з рэкамендацыямі Міжнароднага валютнага фонду, прырост зарплаты ў арганізацыях дзяржаўнай формы ўласнасці і з пераважнай доляй дзяржавы ў статутных фондах не павінен перавысіць 5 працэнтаў», — патлумачыла чыноўніца палітыку дзяржавы ў галіне аплаты працы.

## Здароўе не набудзеш, тым больш па такіх коштах

Але не толькі ў адпачынку ў цёплай Турцыі і мясной нарэзцы пачынаюць адмаўляць сабе беларусы. Па дадзеных Міністэрства аховы здароўя, у студзені кошты на некаторыя імпартныя лекі ў дзяржаўных аптэках выраслі на 20–34 працэнта, на айчынныя — на 0,5–30 працэнтаў. Міністр аховы здароўя Васіль Жарко паведаміў, што ў студзені быў праведзены маніторынг коштаў у дзяржаўных аптэках. Аналіз паказаў, што кошты на імпартныя лекі, увезеныя ў рэспубліку па новых кантрактах, павялічыліся ў адпаведнасці з ростам курсу валют. "Пераацэньванне лекаў не праводзілася, усё лекі, закупленыя ў 2008 годзе, прадаюцца па ранейшых коштах", — цытуе чыноўніка інфармацыйнае агенцтва БелаПАН.

Рост коштаў на айчынныя лекі міністр патлумачыў тым, што прэпараты, як правіла, выпрабляюцца з імпартных кампанентаў. Разам з тым Васіль Жарко паведаміў, што ў аптэках былі зафіксаваныя падвышэнні коштаў на лекі, якія вырабляе беларускае ТАА "Фарматэхналогія", ад 70 да 200 працэнтаў. Міністр паабяцаў, што маніторынг коштаў па найбольш запатрабаваных леках у аптэках усіх форм уласнасці будзе праводзіцца штотыдзень, і ў выпадку неабгрунтаванага значнага падвышэння коштаў інфармацыя пра гэта будзе перадавацца ў Міністэрства эканомікі. Міністэрства аховы здароўя ўжо накіравала ў Мінэканомікі прапанова пашырыць спіс лекавых сродкаў на 93 пазіцыі (зараз у спісе 128 лекаў), кошты на якія рэгулююцца.

## І пра добрае...

Крызіс прынёс з сабой не толькі негатыўныя моманты. Напрыклад, у сталіцы пакрысе пачалі ісці ўніз кошты на арэнду жылля. Калі напрыканцы 2008 года сярэдні кошт арэнды аднапакаёвай кватэры быў каля 300 долараў у месяц, то пасля дэвальвацыі можна разлічваць на дах над галавой за 230–250 долараў і плюс аплата камунальных паслуг. На сталічным рынку арэнды жылля цяпер дастаткова прапаноў, спрыяльных умовы для таго, каб дамовіцца з гаспадарамі пра зніжкі.

Верагодна, што да сярэдзіны вясны кошты ў гэтым сектары эканомікі мусяць апусціцца яшчэ ніжэй. Заробкі ў большасці не растуць, а падаюць разам з курсам беларускага рубля. У такіх умовах многія маладыя сем'і, вымушаныя эканоміць, вяртаюцца назад да бацькоў ці шукаюць больш танныя варыянты.

Звальненні з працы таксама не такое ўжо сусветнае зло, з пункту гледжання наймальніка, канешне. Крызіс — добрая магчымасць пазбавіцца ад кадравага баласту, якім абраслі многія фірмы і кампанія за апошнія гады. Натуральна, працадаўцы пакідаюць найбольш прафесіянальных і дасведчаных супрацоўнікаў. Для тых, хто не можа аднесці сябе да гэтай катэгорыі, надышлі часы задумацца пра ўласны ўзровень адукацыі і ведаў. І, магчыма, адмовіцца ад адпачынку ці лішніх ботаў на карысць курсаў падвышэння кваліфікацыі.

7

# ТэлеТыдзень

TV

## 9 лютага, панядзелак

05.25 Д/с "Таямнічы мір жывёл".
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05, 07.05, 08.10 "Добрай раніцы, Беларусь!"
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.25, 11.55 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.30 У міры матораў.
09.05, 15.25 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.10 Nota Bene.
09.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоў "Жыццё як жыццё". "Я стала ахвярай прыгажосці".
11.05 Меладраматычны серыял "Родныя людзі".
12.10 Вострасюжэтная меладрама "Знак лёсу".
14.05 "Музыка для ўсіх". Канцэртная праграма.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 Гульнявое шоў "ІНТУІЦЫЯ".
16.55 Меладрама "Гарачы лёд" (Расія).
17.50 Меладраматычны серыял "Родныя людзі".
18.50, 01.00 "Зона Х". Крымінальная хроніка.
19.35 "Арэна". Праграма аб спорце.
19.55 Ток-шоў "Ход у адказ".
21.00 Панарама.
21.50, 01.15 Драматычны серыял "Доктар Хаўс". Другі сезон (ЗША). Фільм "Эйфарыя". 1-я серыя.
22.55 Крымінальная драма "Стромкія часы".
01.05 Дзень спорту.
02.00 "Будні чэмпіёнаў". Аляксандр і Андрэй Багдановічы.
02.30 Усе стыхіі.

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
09.05 Контуры.
10.10 АНТ прадстаўляе: "Дыханне планеты".
10.45 Ералаш.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 "Кантрольны закуп".
12.00 "Малахаў+".
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 "Зразумець. Прабачыць".
13.45 "Модны прысуд".
15.00 "Шырокая рака". Серыял. Закл. серыя.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 "Агонь кахання". Шматсерыйны фільм.
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Серыял "Хто ў хаце гаспадар?"
18.55 "Чакай мяне".
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Ток-шоў "Выбар".
22.00 "Група Zeta". Шматсерыйны фільм.
23.00 Нашы навіны.
23.15 Навіны спорту.
23.20 "Зваротны адлік". "Лепельскі бунт".
23.50 "Прафесійны бокс. Альфрэда Ангуло – Андрэй Цуркан".
00.50 Нашы навіны.
01.05 Навіны спорту.

06.00 "24 гадзіны".
06.10 "Міншчына".
06.20 "Раніца. Студыя добрага настрою".
07.30 "24 гадзіны".
07.40 "Раніца. Студыя добрага настрою".
08.30 "Тыдзень". Інфармацыйна-аналітычная праграма.
09.30 "Вялікі сняданак".
10.00 "Пяць гісторый".
10.30 "24 гадзіны".
10.40 "Відавочца прадстаўляе: самае смешнае".
10.55 "Жыццё працягваецца". Тэленавела.
11.45 "Багатая і каханая". Серыял.
12.35 "Ваенная таямніца" з Ігарам Пракапенкам.
13.30 "24 гадзіны".
13.50 "Мой дом".
14.20 "Наша справа".
14.30 "Далёкія сваякі".
14.45 "Фантастычныя гісторыі".
15.35 "Я – вандроўца".
16.00 "Культурнае жыццё" з А. Ефрэмавым.
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Спартовы тыдзень".
17.20 "Міншчына".
17.30 "Званая вячэра".
18.25 "Багатая і каханая". Серыял.
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "Сталічныя падрабязнасці".
20.10 "СТБ-спорт".
20.15 "Добры вечар, маляня".
20.35 Фільм "Вяртаецца муж з камандзіроўкі".
22.30 "24 гадзіны".
22.55 "СТБ-спорт".
23.00 "Салдаты. Новы прызыў". Серыял.
23.55 "Закон і крымінал".
00.00 "Сталічны футбол".
00.30 "Гучная справа".

06.55 Ранішняя падзарадка.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.20 Тэлебарометр.
08.40 Усё аб бяспецы.
09.05 У гэты дзень.
09.10 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
10.05 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
11.00 Вайсковая камедыя "Здравія жадаю!"
12.15 Дакументальны фільм "Я вярнуся".
12.45 Слова пісьменніка.
13.10 Серыял "Адплата за грахі" (Расія).
14.00 Бухта капітанаў.
14.40 Мультсерыял "Сонік Ікс" (Японія).
15.00 Пазакласная гадзіна.
15.15 "Таемны густ". Кулінарная праграма.
15.45 "Шунін і бландынкі". Аўтамабільная праграма.
16.15 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
17.05 Смачна з Барысам Бурдой.
17.35 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Дэтэктыўны серыял "Забойная сіла-3" (Расія).
19.55 Беларуская часіна.
20.50 Калыханка.
21.15 Дэтэктыў "Калье Шарлоты" (СССР). 1-я серыя.
22.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
23.35 Хакей. Формула гульні.

РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.10 Фільм "Каханне французскае і рускае". 1994 г.
10.30 "Ранішняя пошта" з Юрыем Мікалаевым і Ларысай Грыбалёвай".
11.00 Весткі.
11.30 Пакой смеху.
12.25 Уладзімір Шпудэйка ў фільме "Там удалечыні, за ракой". 1976 г.
13.50 Навіны – Беларусь.
14.00 Весткі..
14.20 "Смерць у сядле. Іпадром". Дакументальны фільм.
15.15 "Кулагін і партнёры".
15.50 Суд ідзе.
16.50 Навіны – Беларусь.
17.00 Весткі..
17.25 "Сумленны дэтэктыў". Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
17.55 "Жанчына без мінулага". Тэлесерыял.
18.50 Навіны – Беларусь.
19.00 Весткі..
19.30 Тэлесерыял "Карміліта".
20.30 Тэлесерыял "Карункі".
22.30 "Кулагін і партнёры".
23.00 "Весткі.+".
23.20 Навіны – Беларусь.
23.30 "Стагоддзе Арама Хачатурана". Дакументальны фільм.
00.20 Заканчэнне эфіру.

НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал "Сёння ранніцай".
09.00 Сёння. Выніковая праграма.
10.00 Сёння.
10.25 "Кулінарны паядынак".
11.15 "Кватэрнае пытанне".
12.10 "Следства вялі...".
13.00 Сёння.
13.35 Дэтэктыўны серыял "Закон і парадак: Аддзел аператыўных расследаванняў".
15.10 "Прафесія-рэпарцёр".
15.35 "Агляд.Надзвычайнае здарэнне".
16.00 Сёння.
16.30 Серыял "Кодэкс гонару-2".
18.10 "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
18.30 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
19.00 Сёння.
19.40 Вострасюжэтны серыял "Зверабой".
21.40 "Сумленны панядзелак".
22.35 "Ты не паверыш! Ньюс".
23.00 Сёння.
23.25 Вострасюжэтны серыял "Адрэналін".
00.15 Дэтэктыўны серыял "Лікі".
01.00 "Школа злаславя".

EUROSPORT

09.30 Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
09.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145.
11.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Францыі (Валь д'Ізер). Мужчыны. Хуткасны спуск. Камбінацыя. Прамая трансляцыя.
12.30 Скачкі ў ваду з трампліна. Чэмпіянат Еўропы ў Нідэрландах (Эйндховен). 2-і дзень.
14.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Францыі (Валь д'Ізер). Мужчыны. Хуткасны спуск. Камбінацыя.
15.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Францыі (Валь д'Ізер). Мужчыны. Слалам. Камбінацыя. Прамая трансляцыя.
16.00 Шары. Адкрыты чэмпіянат Уэльса. Фінал.
18.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Агляд 2008 г.
19.00 Футбол. Еўрагалы . Часопіс.
19.45 Футбол. Еўрагалы – Фернанда Торэс.
20.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145.
21.15 Восьдык так!!!
21.30 Армрэстлінг. PAL, NAL.
22.00 Пра рэстлінг. Vintage Collection.
23.30 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total KO.
00.30 Футбол. Еўрагалы . Часопіс.
01.15 Футбол. Еўрагалы . Фернанда Торрес.
01.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Агляд 2008 г.

## 10 лютага, аўторак

05.05 Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.02, 07.05 Прэс-агляд.
06.05 Дзень спорту.
06.15, 07.10, 08.10 "Добрай раніцы, Беларусь!".
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.35 "Арэна". Праграма аб спорце.
09.05, 13.55 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.10 Дэтэктыўная меладрама "Монтэкрыста" (Расія).
10.00 Меладрама "Гарачы лёд" (Расія).
10.50 Меладраматычны серыял "Родныя людзі" (Украіна).
11.40 Відэафільм АТН "Гарадоцкая поўнач" з цыкла "Зямля беларуская".
12.10 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
13.05 Тэлесерыял "Адчайныя хатнія гаспадыні-3" (ЗША).
14.05 Ток-шоў "Ход у адказ".
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Хранікальна-дакументальны цыкл "Нябачны фронт" (Беларусь).
16.05 Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
16.55 Меладрама "Гарачы лёд" (Расія).
17.50 Меладраматычны серыял "Родныя людзі" (Украіна).
18.50, 00.30 "Зона Х". Крымінальная хроніка.
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.55 Дэтэктыўная меладрама "Монтэкрыста" (Расія).
21.00 Панарама.
21.50, 00.50 Драматычны серыял "Доктар Хаўс". Другі сезон (ЗША). Фільм "Эйфарыя". 2-я серыя.
22.55 Камедыя "Дачка майго боса" (ЗША).
00.40 Дзень спорту.

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
09.05 "Чакай мяне".
09.55 Прэм'ера. "Людзі-феномены".
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 АНТ прадстаўляе: "Адзін супраць усіх".
12.00 "Малахаў+".
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 "Зразумець. Прабачыць".
13.45 "Модны прысуд".
15.00 "Руская ў горадзе анёлаў". Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 "Агонь кахання".Шматсерыйны фільм.
17.10 "Хай кажуць" з Андрэем Малахавым.
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Камедыйны серыял "Хто ў хаце гаспадар?". АМЕДЫА (Расія), 2005 год.
18.55 "Рудая". Шматсерыйны фільм. 31-я серыя.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Прэм'ера АНТ. "Жыццё, якога не было". Шматсерыйны фільм.
22.05 Прэм'ера. "Група Zeta". Шматсерыйны фільм.
23.05 Нашы навіны.
23.20 Навіны спорту.
23.25 "Застацца ў жывых". Шматсерыйны фільм.
00.15 "Кліч бездані".
01.10 Нашы навіны.
01.25 Навіны спорту.

06.00 "24 гадзіны".
06.10 "Міншчына".
06.20 "Раніца. Студыя добрага настрою".
07.30 "24 гадзіны".
07.40 "Раніца. Студыя добрага настрою".
08.30 "Відавочца прадстаўляе: самае смешнае".
08.45 Фільм "ВЯРТАЕЦЦА МУЖ З КАМАНДЗІРОЎКІ". Украіна, 2006г.
10.30 "24 гадзіны".
10.40 "Закон і крымінал".
10.50 "Жыццё працягваецца". Тэленавела.
11.45 "Багатая і каханая". Серыял.
12.35 "Гучная справа".
13.30 "24 гадзіны".
13.50 "Новыя вандраванні дылетанта".
14.20 "Далёкія сваякі".
14.40 "Элен і рабяты – 2". Маладзевы серыял.
15.35 "Салдаты. Новы прызыў". Серыял.
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Сталічны футбол".
17.20 "Міншчына".
17.30 "Званая вячэра".
18.25 "Багатая і каханая". Серыял.
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "Сталічныя падрабязнасці".
20.10 "СТБ-спорт".
20.15 "Добры вечар, маляня".
20.30 "Аўтапанарама".
20.55 "Бой з ценем". Серыял.
22.00 "Рэпарцёр СТБ".
22.30 "24 гадзіны".
22.55 "СТБ-спорт".
23.00 "StartUp!" Тэлегульня.
23.25 "Салдаты. Новы прызыў". Серыял.
00.20 "Закон і крымінал".
00.25 "Рэактыўны бокс".
00.55 "Надзвычайныя гісторыі".

06.55 Ранішняя падзарадка.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.20 Дэтэктыўны серыял "Забойная сіла-3" (Расія).
09.15 У гэты дзень.
09.20 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
10.10 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
11.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
11.50 Хакей. Формула гульні.
12.20 Дэтэктыў "Калье Шарлоты" (СССР). 1-я серыя.
13.35 Серыял "Адплата за грахі" (Расія).
14.25 Мультсерыял "Сонік Ікс" (Японія).
15.05 Пазакласная гадзіна.
15.20 Бітва экстрасэнсаў.
16.15 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
17.05 Смачна з Барысам Бурдой.
17.35 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Дэтэктыўны серыял "Забойная сіла-3" (Расія).
19.55 Беларуская часіна.
20.55 Калыханка.
21.15 Дэтэктыў "Калье Шарлоты" (СССР). 2-я серыя.
22.35 Спорт-кадр.
23.00 Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.15 Тэлесерыял "Карміліта".
10.05 Руская серыя. Тэлесерыял "Карункі".
11.00 Весткі.
11.30 Руская серыя. Тэлесерыял "Карункі".
12.20 Наталля Арынбасарова ў фільме "У ноч месяцовага зацьмення". 1978 г.
13.50 Навіны – Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 "Замах на Данаю". Дакументальны фільм.
15.15 "Кулагін і партнёры".
15.50 Суд ідзе.
16.50 Навіны – Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 "Вандраванні натураліста".
17.55 "Жанчына без мінулага". Тэлесерыял.
18.50 Навіны – Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял "Карміліта".
20.30 Руская серыя. Прэм'ерА. Тэлесерыял "Карункі".
21.30 Леў Дураў і Марына Магілёўская ў фільме "Танга над прорвай". 1-я серыя.
23.00 "Весткі+".
23.20 Навіны – Беларусь.
23.30 "Памерці і ўваскрэснуць. Моцныя духам". Дакументальны фільм.
00.25 Заканчэнне эфіру.

НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал "Сёння ранніцай".
09.05 "Праграма Максімум". Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
10.00 Сёння.
10.25 "Чыстасардэчнае прызнанне".
10.50 "Quattroruote". Праграма пра аўтамабілі.
11.20 Дэтэктыўны серыял "Месца пад сонцам".
12.05 "Суд прысяжных".
13.00 Сёння.
13.35 Дэтэктыўны серыял "Шпіёнскія гульні".
15.05 "Проста цырк".
15.30 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
16.00 Сёння.
16.30 Вострасюжэтны серыял "Кодэкс гонару-2".
18.10 "Ты не паверыш! Ньюс".
18.30 "Агляд.Надзвычайнае здарэнне".
19.00 Сёння.
19.40 Вострасюжэтны серыял "Зверабой".
21.40 "Вочная стаўка".
22.35 "Ты не паверыш! Ньюс".
23.00 Сёння.
23.25 Вострасюжэтны серыял "Адрэналін".
00.15 Дэтэктыўны серыял "Лікі".

EUROSPORT

09.30 Экстрэмальны спорт. Маладзевая зона.
10.00 Футбол. Еўрагалы . Часопіс.
10.45 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Агляд 2008 г.
11.45 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Таварыскі матч. Аўстрыя. Турцыя.
12.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Таварыскі матч. Нідэрланды – Швецыя.
13.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Таварыскі матч. Грэцыя – Італія.
15.00 Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). 2-і дзень. Прамая трансляцыя.
16.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145.
18.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). Кваліфікацыя. HS 140. Прамая трансляцыя.
19.00 Футбол. Еўрагалы . Навіны.
19.15 Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). 2-і дзень. Прамая трансляцыя.
21.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). Кваліфікацыя. HS 140.
22.00 Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA у Швейцарыі (Цюрых). Суперцяжкая вагавая катэгорыя. Н. Валуеў (Расія) – Э. Холифілд (ЗША).
00.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Агляд 2008 г.
01.00 Футбол. Еўрагалы . Навіны.
01.15 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). Кваліфікацыя. HS 140.
02.15 Восьдык так!!!

## 15 ЛЮТАГА, НЯДЗЕЛЯ

---

**06.30** Моладзевы серыял “Сэрца акіяна” (Францыя).
**07.00** Меладрама “Сярожа” (СССР).
**08.20** Альманах вандраванняў.
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Грамніц Господніх.
**09.00**, **12.00**, **15.00** Навіны.
**09.05**, **12.10** “Беларусь. Гісторыя Перамогі”.
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял “Як сказаў Джым” (ЗША).
**10.05** Культурныя людзі.
**10.40** Усе стыхіі.
**11.15** У міры матораў.
**11.45** “Еўрафэст. Дзень за днём”.
**12.20** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Камедыя “Тры плюс два” (СССР).
**14.00** Дакументальны серыял “Таямніцы забытых перамог” (Расія).
**14.25** Цыкл “У інтарэсах нацыянальнай бяспекі”. Хранікальна- дакументальны фільм “Інтэрнацыянальны абавязак”.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**16.00** Сямейная камедыя “Дарога дадому. Неверагоднае вандраванне” (ЗША).
**17.40** Суперлато.
**18.40** Прэм’ера. Лірычная камедыя “Урокі спакусы” (Расія).
**20.35** “Спортлато 5 з 36”. Забаўляльнае шоў.
**21.00** “Панарама тыдня” з Максімам Кароткіным.
**22.35** Драма “Імгненні жыцця” (ЗША).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: “Нядзельная раніца”.
**08.00**, **09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** “Шчаслівыя разам”. Камедыйны серыял.
**09.45** “Шалапутныя нататкі” з Дмітрыем Крыловым.
**10.05** Пакуль усе дома.
**10.55** Фазэнда.
**11.30** Разумніцы і разумнікі.
**12.10** АНТ прадстаўляе: “Ранішняя пошта”.
**12.40** “Зваротны адлік”. “Лепельскі бунт”.
**13.10** Фільм “Службовы раман”.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя неверагоднасці. “Звыш магчымасці чалавека”.
**17.05** Прэм’ера. “Рускія ў Галівудзе. Міфы “фабрыкі мар”.
**18.05** Фільм “Паляўнічыя за прывідамі. 5 гадоў праз”.
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: “Дыханне планеты”.
**21.40** “Апошні герой: Забытыя ў раі”.
**22.55** “Камедзі Клаб”.
**23.30** Прэм’ера. Прыгодніцкі фільм “Брыгады Тыгра”. Францыя, 2006 год.

---

**06.55** “Вовачка”. Камедыйны серыял.
**07.50** “Кіно”: Мал Айфенс і Міранда Отта ў фільме “Дэні – шэзлонг, які лётае “. Аўстралія, 2003г.
**09.30** “Аўтапанарама”.
**10.00** “Відавочца прадстаўляе: самае смешнае”.
**10.55** “Вялікі сняданак”.
**11.30** “Маё Каханне”. Камедыйны серыял.
**12.30** “Добры дзень, доктар!”.
**13.00** “Каханне пад наглядам”. Расія, 2007г.
**14.40** “Дарагая перадача”.
**15.05** “Культурнае жыццё” з Аляксандрам Ефрэмавым.
**15.35** “Прыватныя гісторыі”.
**16.30** “24 гадзіны”.
**16.50** “Рэтраманія”.
**18.00** “Фантастычныя гісторыі”.
**19.00** “Аўтапанарама”.
**19.30** “Тыдзень”. Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** “Фільм тыдня”: “Русалка”. Расія, 2007г.
**22.30** “Спартовы тыдзень”.
**23.00** “Вялікая гісторыя”: “Галівуд. Руская дарожка”.
**00.35** “Сакрэтныя матэрыялы”. Серыял.

---

**07.35** Дабравест.
**08.00** Мір вашаму дому.
**08.10** Бухта капітанаў.
**08.50** Наша пяцёрачка.
**09.55** Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**10.50** Фільм “Прыгоды Тома Сойера і Гекльберы Фіна” (СССР). 3-я серыя, заключная.
**11.55** Мультфільм.
**12.10** Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.05** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**13.40** Пасоўванне+.
**13.55** Гаспадар.
**14.25** Спявай, душа.by.
**14.55** Меладраматычны серыял “Дзве зоркі” (Індыя).
**17.10** Гісторыка-прыгодніцкі фільм “Мяцеж на “Баунці” (ЗША).
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** “Правы чалавека”. Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**20.55** Серыял “Доктар Жывага” (Расія).
**22.40** Свая музыка.
**23.10** Пасоўванне +.
**23.40** Ваенная драма “Груз 300” (СССР).

---

**07.00** “Здабытак рэспублікі”.
**07.15** Людміла Чурсіна і Міхаіл Галубовіч у фільме “Гонка з пераследам”.1979 г.
**08.45** Мультфільмы.
**09.25** “Смехапанарама” Яўгенія Петрасяна.
**10.25** “Гарадок”. Дайджэст.
**11.00** Весткі.
**11.10** “Сам сабе рэжысёр”.
**12.10** “Хто ў хаце гаспадар”.
**12.45** “Ха!” Маленькія камедыі.
**13.00** Дэтэктыў “Марш Турэцкага. Новае прызначэнне”. Фільм 8, “Секта”. 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** Дэтэктыў “Смерць пад ветразем”. 1976 г.
**17.35** Прэм’ера. “Правілы самай абаяльнай. Ірына Мураўёва”. Дакументальны фільм.
**18.25** “Сумленны дэтэктыў”. Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**19.00** Весткі тыдні.
**20.05** “Адмысловы карэспандэнт”.
**20.30** Фільм “Жаночае сяброўства”. 2007 г.
**22.30** Наталля Крачкоўская, Міхаіл Какшэнаў, Уладзімір Носік у камедыі “Пляменнік, або Рускі бізнэс - 2”. 2002 г.
**00.15** Заканчэнне эфіру.

---

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** “Дзікі мір” з Цімафеем Бажэнавым.
**08.45** “Іх норавы”.
**09.25** “Ядзім дома!”.
**10.00** Сёння.
**10.20** “Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень”.
**10.50** “Quattroruote”. Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** “Авіятары”.
**11.50** “Дачны адказ”.
**12.40** “Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне”.
**13.00** Сёння.
**13.25** “Крамлёўскія пахаванні”.
**14.10** Фантастычная камедыя “Кароткае замыканне”.
**16.00** Сёння.
**16.30** “Змаганне за ўласнасць”.
**17.00** Дэтэктыўны серыял “Закон і парадак: Аддзел аператыўных расследаванняў”.
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.50** “Чыстасардэчнае прызнанне”.
**20.20** “Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень”.
**20.55** “Галоўны герой” з Антонам Хрэкавым.
**22.00** Аляксей Чадаў, Інгеборга Дапкунайтэ, Сяргей Бадроў у баявіку “Вайна”.
**00.10** Вострасюжэтная моладзевая драма “О”.

---

**09.30** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету ў Германіі (Аберстдорф). Камандныя спаборніцтвы. HS 213.
**10.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьен-Чанг). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**10.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Францыі (Валь д’Ізер). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьен-Чанг). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Аберстдорф). Камандныя спаборніцтвы. HS 213.
**13.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). HS 140. Прамая трансляцыя.
**14.15** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Францыі (Валь д’Ізер). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Аберстдорф). HS 213. Прамая трансляцыя.
**17.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). 15 км па сістэме Гундерсена.
**18.15** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**18.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьен-Чанг). Жанчыны. Гонка пераследу.
**19.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьен-Чанг). Мужчыны. Гонка пераследу.
**19.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Францыі (Валь д’Ізер). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба.
**20.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Фінал.
**21.30** Лёгкая атлетыка. Спаборніцтва ў памяшканні (Карлсруэ, Германія).
**23.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьен-Чанг). Жанчыны. Гонка пераследу.
**23.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі (Пьен-Чанг). Мужчыны. Гонка пераследу.
**00.00** Ралі. Чэмпіянат свету. “Ралі Нарвегіі”. 3-і дзень.
**00.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Каліфорніі. 2-і этап. Дэвіс - Санта-Раса. Прамая трансляцыя.
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету. “Ралі Нарвегіі”. 3-і дзень.

---

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________ (по реестру ф. 11)
№ ____________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты “Новы час”

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.

(сумма прописью)

Кому / Куда: Г-та “Новы час”, р/с 3012211080010 фил. МГДОАО “Белинвестбанк”, код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть) | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______

Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть) | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______

Кассир

ЦІКАВА

# СЯМЕЙНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КАМУНІСТА СІМАНЕНКІ

Іван Біч

**Секс-сімвалам Украіны нечакана стаў лідэр камуністаў, які публічна прызнаўся, што мае каханку, малодшую за яго на 25 гадоў.**

У сямейным жыцці галоўнага камуніста Украіны Пятра Сіманенкі (56 гадоў) надыходзяць вясёлыя часы. Ён спрабуе скасаваць шлюб са сваёй жонкай Святланай, каб ажаніцца з маладой журналісткай.

Святлана і Пётр аднагодкі. Яны сябруюць з 9-га класа. Пазнаёміліся падчас гульні ў шахматы. Святлана тады перамагла Пятра, што прымусіла яго па-іншаму паглядзець на дзяўчыну. Ад шлюбу Сіманенкі маюць двух сыноў — Андрэя (1974) і Канстанціна (1977). А таксама ўнукаў — дзевяцігадовага Валодзю і пяцігадовую Лізу.

Здавалася б, сям'я кіраўніка КПУ — моцная ячэйка грамадства. Тым больш, Сіманенка — не нейкі радыкальны камуніст, паслядоўнік Аляксандры Калантай, якая прапагандавала тэорыю "шклянкі вады" і вольны шлюб. Ён — камуніст старой савецкай закваскі.

І вось — нечаканы разрыў. Прычына банальная — Аксана Вашчанка, што нарадзілася ў 1978 годзе, парламенцкая журналістка кампаній Украінскага радыё і станцыі "Эра".

Адносіны паміж Аксанай і Пятром ўяна выйшлі за межы флірту. Тыдзень таму Вашчанка нарадзіла галоўнаму камуністу краіны дачку. Ёй ужо далі імя Марыя. Застаецца дадаць, што роды прайшлі ў элітным шпіталі Ісіда.

Раман Сіманенкі і Аксаны, як піша ўкраінская жоўтая прэса, цягнецца з 2004 года, калі ва Украіне пачалася прэзідэнцкая кампанія. Тады маладую журналістку накіравалі ў каманду Сіманенкі, які таксама балатаваўся на пасаду кіраўніка дзяржавы. Разам ім давялося ездзіць па ўсёй краіне. Пасля гэтага яны пасябравалі. Пачаўся раман. Сіманенка не сквапіўся на падарункі. Кожны раз ён дараваў ёй па 50 ружаў.

Самае смешнае, што шмат хто з палітычнага бамонду ведаў пра паходы галоўнага камуніста налева. Адзін з дэпутатаў-камуністаў на ўмовах ананімнасці паведаміў прэсе, што Аксана даўно стала прычынай канфлікту ў сям'і Сіманенкі. Жонка не магла прабачыць мужу здрады.

Часта закаханых бачылі і наведвальнікі клуба "5-ы элемент" (адзін з самых вядомых клубаў Кіева). Афіцыянтам яны запомніліся сваім аўтамабілем "Лексус" і дарагімі аксесуарамі.

Узнікае лагічнае пытанне: калі ўсе ведалі, чаму праўда выплыла толькі зараз? Шмат якія эксперты падазраюць, што тут не абышлося без палітыкі.

Па-першае, сам Сіманенка вельмі асцярожна і мала гаворыць на гэту тэму. Часам катэгарычна заяўляе: "Я не буду адказваць на любыя пытанні. Гэта маё асабістае жыццё".

Затое яго жонка ахвотна распавядае пікантныя падрабязнасці, кшталту: "Пётр Мікалаевіч ужо паўгода не жыве дома, яна (Аксана) мне тэлефанавала, а я не брала слухаўку". Таксама высвятляецца, што лідэр КПУ ўжо спрабаваў развесціся з жонкай, аднак Данецкі суд адмовіў у разглядзе справы, паколькі Святлана і Пётр прапісаныя ў Кіеве. Цяпер Сіманенка будзе спрабаваць атрымаць развод у сталіцы. Аднак зрабіць гэта будзе цяжка. Пакуль фармальная жонка адмаўляецца даць яму свабоду.



Пётр Сіманенка



Аксана Вашчанка

"Я жадаю захаваць сям'ю. Ён увесь час казаў пра мараль, і такім чынам закалыхаў маю пільнасць", — лічыць Святлана. У яе ёсць яшчэ шмат цікавых аргументаў кшталту: "Яна яго апаіла, адурманіла, а Пеця як мужык на яе клюнуў".

Апошнім часам Святлана любіць паўтараць пра неадпаведнасць Пятра Сіманенкі прынцыпам этыкі камуністычнага правадыра. "Гэта не варты камуніста ўчынак", — кажа яна. Якраз гэты момант вельмі цікавіць палітолагаў. Імідж лавеласа кепска пасуе вобразу сапраўднага камуніста і можа адлюстравацца на шанцах Сіманенкі стаць кандыдатам на пасаду прэзідэнта ў наступным годзе. Ходзяць чуткі, што менавіта канкурэнты Сіманенкі падштурхнулі Святлану зладзіць скандал. Такой думкі прытрымліваецца і сам Сіманенка.

Калі скандал справакавалі праціўнікі старшыні КПУ, то разлік быў зроблены правільны. Амурныя прыгоды Пятра будуць яму каштаваць нейкіх пунктаў. У КПУ назіраецца відавочны раскол па пытанню наконт таго, як ставіцца да ўчынку лідэра. Адны камуністы робяць выгляд, што нічога не здарылася. "Сям'я — асабістае справа кожнага. Нідзе не напісана, што развод парушае камуністычныя прынцыпы", — заявіў дэпутат КПУ Аляксандр Голуб.

Другія, як Юры Саламацін, кажуць, што паводзіны Святланы Сіманенка можна зразумець: яна маці і жонка. А калі б такое здарылася ў былой КПСС, Сіманенка паклаў бы партбілет на стол.

На інтэрнэт-форумах відавочна, што жаночы электарат вельмі крытычна ўспрыняў учынак Сіманенкі. У прыклад ставяць Віктара Януковіча. Яго жонка даўно стала аб'ектам жартаў за свой, на думку некаторых, не вельмі прывабны знешні выгляд. Аднак Януковіч вядомы як добры сем'янін.

У іншых каментарах дамінуюць наступныя думкі: "Сіманенка правільна зрабіў, што кінуў старую непрыгожую мымру, якая перастала сачыць за сабой. Сапраўдны мужык!" і "Ва ўсім вінаватая журналістка, якая акруціла чалавека, што мае грошы. Але няхай не радуецца: на чужым няшчасці свайго шчасця не пабудуеш".

Аднак найбольш арыгінальную думку выказаў вядомы журналіст Яўген Ехельзон. Ён лічыць, што адзюльтэр Сіманенкі адчыняе каласальныя гарызонты ператварэння КПУ з партыі сталіністаў-маразматыкаў у партыю нармальных еўрапейскіх левых, якія падтрымліваюць жаночы рух, лесбіянак, гомасексуалістаў, прынцып вольнага шлюбу і г.д.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Аднак зразумела, што сапраўдная мэта новай ініцыятывы Еўрасаюза ("Усходняе партнёрства") — фармаванне санітарнага кардону па перыметры мяжы Расіі. Іншымі словамі, ЕС пашырае сваю жыццёвую прастору за кошт расійскай. Адно з ключавых пытанняў — ці прамяняюць Беларусь ці Арменія выгоды, якія маюць ад супрацоўніцтва з Расіяй, на еўрасаюзнага жорава ў небе. Наўрад ці Аляксандр Лукашэнка пагодзіцца на дэіндустрыялізацыю рэспублікі, махнуўшы рукой на скачок адмоўнага знешнегандлёвага сальда, і атрымае задавальненне ад навалы іскаў у Еўрапейскі суд. Акрамя таго, прывядзенне нацыянальнага заканадаўства да нормаў ЕС (у тым ліку і практыкі ўжывання законаў) — задача з шэрагу подзвігаў Геракла. Па сутнасці, гэта значыць разбурэнне ўсёй беларускай сістэмы.

**Вести.com (Расія)**

Пасля газавай вайны Лукашэнка і Юшчанка сустрэліся і дамовіліся наконт шэрагу агульных праектаў. Адзін з іх тычыўся транспарціроўкі азербайджанскай нафты ў абыход Расіі праз Украіну і Беларусь. Паказальна, што Масква паспяшалася пакараць Мінск за інтарэс да Каспійскай нафты, адмовіўшы ў вялікім рублёвым крэдыце. У Маскве, здаецца, палічылі, што Мінск праводзіць дастаткова нелаяльную палітыку, каб разлічваць на субсідыі. А гэта не пакідае сумневаў, што энергетычная галіна робіцца для Масквы асноўнай. І якраз тут трэба чакаць асноўных падзей, калі інтарэс да Каспійскай нафты пачне трактавацца Масквой амаль як дэмантаж Бронзавага салдата ў Таліне.

**"Эхо" (Азербайджан).**

Раней панавала версія, што Беларусь будзе ўдзельнічаць у праграме саміта выключна на экспертным узроўні. Аднак прэзідэнт Лукашэнка пайшоў на невялікую лібералізацыю рэжыму, і ў кастрычніку мінулага года ЕС адмяніла забарону на ўезд беларускіх чыноўнікаў. Не выключаны прыезд у Прагу і прэзідэнта Беларусі, які робіць паслядоўныя крокі збліжэння з Еўропай. Каго на саміце дакладна не будзе, дык гэта Расія.

**Gazeta.ru (Расія)**

Не чакае ніякіх кардынальных рашэнняў ад пасяджэння дзяржсавету Саюзнай дзяржавы прадстаўнік фракцыі КПРФ Алег Кулікоў. Парламентарый кажа, што ў цяперашніх эканамічных умовах перспектывы стварэння Саюзу Беларусі і Расіі вельмі маленькія, паколькі прайшлі часы, калі быў як нармальны бюджэт, так і больш спакойная сітуацыя. "Ва ўмовах крызісу, калі мы не здольныя выконваць усе эканамічныя пажаданні Беларусі, і яна мае пазычаць грошы ў Міжнароднага валютнага фонду, назіраецца пахаладанне ў расійска-беларускіх адносінах.

**REGIONS.RU (Расія)**

Рыторыка Лукашэнкі выразна антыамерыканская, аднак, як і ў выпадку з Арменіяй, ад геаграфіі не збегчы. Рэспубліка Беларусь знаходзіцца ў Еўропе, таму цалкам ісці на разрыў з Захадам Лукашэнка не можа. Другі аспект — унутраная палітыка і бізнес. Любая саступка Мінска Маскве ўспрымаецца камандай Лукашэнкі вельмі балюча: ці не стане гэта пачаткам актыўнай інтэрвенцыі расійскага бізнесу ў беларускую гаспадарку (гэта ў Мінску разглядаюць таксама як пагрозу асабістай уладзе Бацькі).

**"Частный корреспондент" (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КАЛУМБІЯ



Партызанская групоўка "Вайсковыя рэвалюцыйныя сілы Калумбіі" (FARC) у аднабаковым парадку пачала маштабную аперацыю. Па сваёй волі FARC выпусціла шэсць заложнікаў — пяць палонных паліцэйскіх і аднаго салдата. FARC — мааісцкай арганізацыя, якая кантралюе значную частку краіны. Захоп шэсць гадоў таму Інгрыд Бетанкур — грамадзянкі Калумбіі і Францыі, кандыдата ў прэзідэнты, якую вызвалілі толькі ў мінулым годзе, вельмі негатыўна паўплываў на імідж FARC і адвярнуў ад арганізацыі былых саюзнікаў (прафсаюзы, левыя партыі) і часткова спонсараў (Венесуэла і Куба). Цяпер, каб вярнуць пазітыўны вобраз, FARC паступова выпускае заложнікаў. Больш таго, як заявіў кубінскі сенатар-камуніст, які кантактуе з FARC, хутка будуць вызваленыя ўсе заложнікі. Вызваленне пройдзе ў тры этапы. Усяго FARC да гэтага часу ўтрымлівае 700 заложнікаў з трох тысяч, якія былі захоплены за 40 гадоў вайны ўладаў і паўстанцаў.

### БОСНІЯ І ГЕРЦАГАВІНА



Боснія і Герцагавіна — краіна, якая ўзнікла ў 1995 годзе пасля вайны на Балканах як дзіўны кангламерат з сербскай, мусульманскай і харвацкай зонаў. Праз 14 гадоў мясцовыя палітыкі палічылі такі фармат не самым аптымальным. Напрыканцы студзеня паміж вядучымі партыямі трох этнічных камунаў была падпісана дамова аб новай формуле дзяржаўнай арганізацыі. Такім чынам, бліжэйшым часам край будзе складацца з чатырох адміністратыўных адзінак: мусульманскай, сербскай, харвацкай і федэральнай зонаў (сталічны горад Сараева). Акрамя таго, мусульмане і харваты сфармуюць дадатковую адміністратыўную адзінку ў межах федэрацыі. Хаця афіцыйна ўсе падпісанты сцвярджаюць, што сэнс новай схемы — аптымізаваць дзейнасць дзяржаўнага апарату. Шматлікія эксперты кажуць, што з падпісаннем дакументу пачаўся падзел краю як мінімум на дзве часткі: сербскую і мусульманска-харвацкую. Прычым падзел можа адбыцца хутчэй, чым думаюць некаторыя. 23 лютага ў горадзе Мастар пройдзе новая сустрэча партый з гэтай нагоды. У той жа дзень можа пачацца пахаванне Босніі і Герцагавіны.

### ІСЛАНДЫЯ



Для Ісландыі, якая апынулася ў крызісе, адзінае выратаванне — гэта ўступленне ў Еўрасаюз. Так думаць усё больш ісландцаў, якія доўгі час круцілі носам, калі мова ішла пра магчымае ўступленне краіны ў склад ЕС. Цяпер настроі ў грамадстве абсалютна іншыя. Крыніцы ў дзяржаўных структурах Рэйк'явіка кажуць, што заяўка будзе пададзена ў маі, пасля датэрміновых выбараў у парламент. Паколькі ўзровень жыцця і стан дэмакратычных інстытутаў краіны не выклікае сумневаў, прыём Ісландыі ў структуры будзе справай хутчэй тэхнічнай. Праўда, Олі Рэён, еўрапейскі камісар па справах пашырэння, кажа, што ЕС звычайна не прымае краіны паасобку. Таму калі Ісландыя і ўступіць у Саюз, то разам з іншай краінай. Цяпер галоўны кандыдат на сяброўства ў Еўрасаюзе — Харватыя, якую павінны прыняць у 2011 годзе. Дарэчы, нягледзячы на той факт, што ў Ісландыі дэмакратыя ўзнікла раней, чым у шматлікіх краінах Еўропы, некаторыя партыі ў ЕС выступілі супраць ісландскіх амбіцый. Мова пра кансерватараў Нідэрландаў, якія лічацца самымі заўзятымі праціўнікамі прыняцця ў ЕС Турцыі. Кансерватары баяцца, што краіна з дэфолтам нацыянальнай валюты — не вельмі добры падарунак для эканомікі ЕС.

### ГЕРМАНІЯ



Да 2014 года ў Лейпцыгу павінен з'явіцца манумент адзінству і свабодзе ў памяць пра мірную рэвалюцыю ў былой ГДР у 1989 годзе. Пра гэта паведаміў міністр культуры Германіі Бернд Нойман.

Лейпцыг быў адным з цэнтраў пратэстаў супраць парушэння грамадзянскіх правоў у ГДР. Федэральны ўрад гатовы выдзеліць на ўзвядзенне помніка да пяці мільёнаў еўра.

Раней бундэстаг ужо прыняў рашэнне пра стварэнне помніка адзінству на палацавай плошчы ў Берліне.

ПРАБЛЕМА

# ЗАГАДКА КАМІСАРАЎ

Алег Пятроў

**Улады Азербайджана перапахавалі рэшткі 26-ці бакінскіх камісараў. У праекцыі на нашу рэчаіснасць, гэта тое ж самае, што вынесці цела Леніна з Маўзалея.**



«Расстрэл 26 бакінскіх камісараў». Гарэльеф. Граніт. 1924–1946. Усталяваны ў Баку ў 1958 годзе. Фрагмент

Каб зразумець сутнасць праблемы, патрэбны невялікі экскурс у гісторыю. Прынамсі варта агучыць версію, якая выкладалася ў савецкіх падручніках.

У сакавіку 1918 года ў Баку быў створаны савецкі ўрад, які складаўся з 26-ці камісараў. Наўрад ці яго можна лічыць выключна бальшавіцкім: сябрамі ўраду былі прадстаўнікі розных партый. Стракатым быў і нацыянальны склад кіраўніцтва Бакінскай камуны: сем армян, тры грузіны, два азербайджанцы, яўрэі, рускія, немцы.

Кіраваў органам Сцяпан Шаўмян — этнічны армянін. Дарэчы, нічога дзіўнага тут няма: да пагрому 1990 года ў сталіцы Азербайджана пражывала вялікая армянская грамада.

Так ці інакш, супрацьстаяць наступу асманскіх войскаў і атрадаў басмачоў, падтрыманых туркамі, камісары былі не ў стане. Яны спрабавалі эвакуявацца ў Астрахань, аднак паліва на караблі хапіла толькі для таго, каб даплысць да Красназаводску (цяперашняя тэрыторыя Туркменістану). Красназаводск кантраляваўся эсэрамі, за якімі стаялі англічане. Па іх загаду бакінскіх камісараў вырашылі паставіць да сценкі.

У 1920 годзе бальшавікі вярнуліся ў Баку. Захапіўшы Азербайджан, яны ўзгадалі пра камісараў, прывезлі іх целы з Туркменіі і святочна пахавалі ў бакінскім парку Сахіл. Камісары ў дзяржаўнай міфалогіі савецкага Азербайджану адыгрывалі такую ж важную сімвалічную ролю, як партызаны ў Беларусі.

Ішлі гады. Знік СССР, Азербайджанская ССР стала незалежнай краінай. Спачатку да ўлады прыйшлі нацыяналісты з Народнага фронту, якіх праз пару гадоў у выніку перавароту змяніў рэжым аўтарытарнага палітыка Аліева. Мемарыял у парку Сахіл нягледзячы на ўсе палітычныя пературбацыі спакойна існаваў. Пакуль улетку мінулага года муніцыпалітэт Баку не вырашыў пачаць рэканструкцыю парку, што па праекту ўключала разбурэнне мемарыяла 26-ці камісараў. Рашэнне сталічнай мэрыі было рэалізавана ў жыццё на мінулым тыдні. Былых камісараў перапахавалі на гарадскім цвінтары.

Акцыя гарадскіх уладаў выклікала не толькі палітычны, але і міжнародны скандал. Найперш пратэставалі камуністы. Азербайджанскія паслядоўнікі Маркса і Леніна ў гнеўнай рэзалюцыі ўказвалі: "Гераізм бакінскіх камісараў набыў сусветную вядомасць і стаў прыкладам для дзесяткаў мільёнаў савецкіх грамадзян, адным з самых яскравых эпізодаў савецкай гісторыі. Помнік 26 камісарам належыць усяму працоўнаму Азербайджану, усім братэрскім народам былога СССР. Ніхто не мае права яго разбураць". Такую ж трактоўку падтрымалі камуністы Арменіі, Грузіі і Расіі.

Фармальна крытычную пазіцыю да падзей у парку Сахіл заняла і Расія. Справа, думаецца, у тым, што так ці інакш дэмантаж мемарыяла 26 камісарам сімвалічна нагадвае дэмантаж іншага славутага савецкага помніка — Бронзавага салдата ў Таліне. Праўда, адміністрацыя прэзідэнта Ільхама Аліева, якога ЗША крытыкуюць за парушэнне правоў чалавека, Крамлю бліжэй, чым эстонскі ўрад. Таму пасол Расіі ў Баку зрабіў вельмі цікавую заяву. Ён паведаміў, што ён супраць разбурэння мемарыяла, аднак пратэставаць не заклікаў. Прапанаваў толькі паведаміць пра перапахаванне 26-ці бакінскіх камісараў іх нашчадкам.

Нарэшце, супраць дэмантажу помніка выступілі шматлікія культурныя дзеячы Азербайджана. Іх незадавальненне выклікаў той факт, што на месцы мемарыяла плануецца пабудаваць вялікі камерцыйны цэнтр з падземным гаражом.

Лагер тых, хто падтрымлівае дэмантаж помніка, складаецца, галоўным чынам, з нацыяналістаў, якія ўвогуле знаходзяцца ў апазіцыі. Фактычна ў канфлікце вакол мемарыяла яны сталі інструментам улады.

Цэнтральнае месца ў іх аргументацыі адыгрывае тэзіс пра тое, што Азербайджанская ССР і яе прамы папярэднік — Бакінская камуна — былі прадуктамі шпіёнаў армянскіх партый. Яны быццам разглядалі АзССР як сродак тармажэння росту нацыянальнай свядомасці мясцовага насельніцтва. Доказам гэтага служыць той факт, што толькі ў 1933 годзе старшынёй Кампартыі АзССР стаў азербайджанец. Да таго часу кіраўнікамі Кампартыі былі армяне: Мікаян, Мірзаян, Рубенаў.

Азербайджанскія нацыяналісты перакананыя, што ніякіх герояў-пакутнікаў не існавала. Была спланавана Мікаянам аперацыя. Падставы для такіх інсінуацый даў цікавы артыкул у газеце брытанскіх камуністаў «Morninq star», апублікаваны ў 1979 годзе. Адпаведна яму, бакінскія камісараў ніхто не забіваў. Брытанцы вывезлі іх спачатку ў Ташкент, а потым у Індыю. Аўтар артыкулу сцвярджае, што Шаўмян спакойна памёр у Індыі ў 70-я гады. Той факт, што «Morninq star» — газета англійскіх камуністаў — фінансавалася з Масквы, дазваляе разглядаць публікацыю як свядомы выкід кампрамату супраць армянскага падполля (напрыканцы 70-х армянская эміграцыя арганізавала шэраг тэрактаў, выступаючы супраць прыгнёту армян у СССР).

Дэмантаж помніка 26-ці камісарам даў прыхільнікам гэтай версіі новыя козыры: пад мемарыяльным комплексам знайшлі не 26 целаў, а толькі 23. На кожным з нябожчыкаў былі біркі з персанальнымі дадзенымі. Сярод знойдзеных і перапахаваных камісараў адсутнічала цела з біркай "Сцяпан Шаўмян".

Ці азначае тое, што нацыяналісты маюць рацыю? Пакуль гэта толькі версія. Пахаванне камісараў у 1920 годзе было знята на кінастужку. На кадрах ёсць усе 26 целаў. Тыя, хто апаніруе азербайджанскім нацыяналістам, дапускаюць, што некаторыя целы маглі быць пазней скрадзеныя з магілак. Каб даказаць сваю праўату, патомкі Шаўмяна пагадзіліся прайсці ДНК-тэст, каб давесці, што адзін з захаваных у парку іх родзіч.

У любым выпадку, гісторыя вакол нябожчыкаў вельмі зручная для афіцыйнага Баку. На другім плане грамадскай дыскусіі аказалася важная ініцыятыва ўладаў. Кіруючая партыя "Ені Азербайджан" ("Новы Азербайджан") на днях прапанавала парламенту адмяніць абмежаванні на пераабранне прэзідэнта краіны. Раней па канстытуцыі грамадзянін мог абірацца на пасаду кіраўніка дзяржавы толькі два разы. "Гэта абмяжоўвае права народу на выбар", — сказана ў заяве "Ені Азербайджан".

І вожыку зразумела, што ініцыятыва новых азербайджанцаў звязана з пікантным становішчам цяперашняга прэзідэнта. 15 верасня мінулага года Ільхам Аліеў быў абраны на пасаду прэзідэнта другі раз, і цяпер даводзіцца думаць, якім чынам падкарэктаваць канстытуцыю пад новае абранне Ільхама Аліева. Еўропа ўжо асудзіла ініцыятыву рэферэндуму па папраўках у канстытуцыю. А нацыяналістам пакуль не да гэтага: яны заняты пазнавальнай гістарычнай дыскусіяй: хто ж былі 26 бакінскіх камісараў.

ПРЫЗНАЧЭННЕ

# ПРЭМ’ЕР НЕТРАДЫЦЫЙНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ

Алег Новікаў

**26 студзеня кіраўніком ураду Ісландыі стала Йохана Сігурдардацір, якая стала першым у гісторыі прэм’ерам, які прытрымліваецца нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі.**



2009 год толькі пачаўся, аднак ужо разбурыў шмат стэрэатыпаў пра правілы палітычнай гульні. Спачатку прэзідэнтам ЗША упершыню ў гісторыі стаў чарнаскуры палітык Барак Абама. Літаральна праз пару дзён урад Ісландыі ўзначаліла сябра Сацыял-дэмакратычнага альянсу Йохана Сігурдардацір. Упершыню ў гісторыі кіраўніком ураду краіны стала лесбіянка.

Натуральна, некаторыя кансерватыўныя выданні пішуць, што прызначэнне такой асобы на высокую дзяржаўную пасаду магло адбыцца выключна ў такія цяжкія часы, як цяпер. Быццам ніхто з нармальных палітыкаў не захоча рызыкаваць і несці адказнасць за курс краіны. А лесбіянкам губляць няма чаго.

Аднак, калі паглядзіш на біяграфію цяперашняга ісландскага прэм’ера, дык можна казаць, што не ўсё так проста. Йохана нарадзілася ў 1942 годзе. Вучылася ў камерцыйным інстытуце. Атрымала дыплом і пачала сваю працоўную кар’еру з самых нізоў. Спачатку працавала сцюардэсай, потым — на фабрыцы. Выйшла замуж за банкіра і нарадзіла яму двух сыноў. Яшчэ падчас працы на фабрыцы была актыўным сябрам прафсаюзаў. Праз прафсаюзы яна прыйшла ў палітыку — стала сябрам Сацыял-дэмакратычнай партыі. У 1978 годзе, калі ёй было 36 гадоў, Йохана упершыню была абраная ў парламент. У 1987-м ёй ужо даручылі міністэрства.

У цяперашнім парламенце яна — самы вопытны дэпутат. Йохана тройчы абіралася ў парламент. Акрамя таго, чатыры разы кіравала Міністэрствам сацыяльнай аховы ў розных кабінетах.

Нягледзячы на такую палітычную кар’еру, Сігурдардацір заўсёды была сціплай. Так, будучы ўжо міністрам, яна адмовілася ад службовай машыны. Адпаведна апытанням, якія былі праведзены ў снежні мінулага года, 73 працэнта грамадзян краіны лічаць вынікі яе працы “пазітыўнымі”. Простыя людзі часта называюць яе “Святая Йохана”.

Праўда, былі і ў Святой Йоханы памылкі. У сярэдзіне 90-х яна беспаспяхова спрабавала стаць старшынёй партыі, аднак прайграла выбары. Пасля спрабавала стварыць сваю Дэмакратычную партыю, маніфест якой называўся “Мой час яшчэ прыйдзе”. Гэта фраза стала папулярнай у краіне, аднак успрымалася хутчэй з іранічным падтэкстам. Партыйнае будаўніцтва закончылася тым, што Йохана вярнулася да сацыял-дэмакратаў. З часам яна аднавіла свае пазіцыі ў кіраўніцтве. У папярэднім урадзе Йохана займала пасаду міністра сацыяльнай абароны.

У студзені былы ўрад кансерватараў і сацыял-дэмакратаў сышоў у адстаўку. Новы сфармавалі сацыял-дэмакраты і партыя “Левыя зялёныя”. “Гэта будзе кабінет сацыяльнай справядлівасці”, — заявіла прэм’ер, калі прадстаўляла склад свайго ўраду. Таксама можна прагназаваць, што пры Сігурдардацір Ісландыя перагледзіць сваю еўрапейскую палітыку. Доўгі час край адмаўляўся ад шчыльнай кааперацыі з Бруселем, апасаючыся за свае рыбныя запасы. Цяпер, калі Ісландыя зразумела, што яе эканоміка вельмі слабая, краіна падасць заяву на атрыманне сяброўства ў ЕС. Афіцыйна пра гэта будзе заяўлена ў красавіку.

Нарэшце, “пра гэта”. Шматлікія ісландцы, шчыра кажучы, нядаўна даведаліся, што Йохана — лесбіянка. Яна жыве з Йонінай Лёдацір, вядомай у краіне актрысай і аўтарам тэатральных п’ес. Нягледзячы на тое, што яны ажаніліся публічна, падрабязнасці інтымнага жыцця новага прэм’ера не сталі тэмай газетных публікацый.

Аднак масавага шоку такая навіна не выклікала. Ісландыя даўно праводзіць палітыку абароны правоў сексуальных меншасцяў. Мясцовы закон нават дазваляе такім парам усынаўляць дзяцей.

“Быць геем або лесбіянкай — не праблема ў Ісландыі, — кажа ў інтэрв’ю адной з брытанскіх газет Фросці Йонсан, старшыня асацыяцыі геяў і лесбіянак Ісландыі. — Ёсць шмат вядомых палітычных постацяў і буйных бізнесменаў, якія адкрыта кажуць пра сваю арыентацыю, і гэта даўно ўжо не ўплывае на іх магчымасці кар’ернага росту і шанцы заняць высокія пасады”.

У тым жа інтэрв’ю Йонсан заявіў, што для яго асацыяцыі зараз куды больш важны лёс краіны і гаспадаркі. Думаецца, ён мае рацыю. Кошты на прадукты з пачатку крызісу выраслі на 73 працэнты, колькасць беспрацоўных дасягнула адзнакі ў дзесяць працэнтаў.

Ад Йоханы чакаюць вельмі шмат, аднак гэта не характэрная для славянскай палітычнай культуры сляпая вера ў асабісты геній палітыка.

“Я не думаю, што з яе атрымаецца месія, які выратуе краіну. Не думаю, што трэба чакаць цудаў. Аднак пасля папярэдняй генерацыі элітных палітыкаў, якія ігнаравалі нас, яе з’яўленне — нешта свежае”, — пракаментаваў на вуліцы для брытанскіх журналістаў, прызначэнне Йоханы адзін з мінакоў.

А можа, цуд усё ж магчымы? 2009-ы — год сюрпрызаў — толькі пачынаецца.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МІХАІЛ СААКАШВІЛІ



У Грузіі раскрылі чарговую шпіёнскую змову. На базе дакументаў спецыяльных службаў суд Тбілісі даў згоду на затрыманне на два месяцы двух прадстаўнікоў армянскай грамады Грузіі як шпіёнаў і кантрабандыстаў зброі. Шпіянажам і кантрабандай, калі верыць суду, тыя займаліся, каб аддзяліць ад Грузіі Джавахецi. Джавахецi — раён кампактнага пражывання армян на поўдні краіны. Тут налічваецца прыкладна 240 тысяч чалавек, палова з якіх — этнічныя армяне. Сацыяльная сітуацыя ў краі зараз вельмі складаная, асабліва пасля таго, як расійская армія пакінула мясцовую вайсковую базу, на якой трымалася ўся інфраструктура. Таму ў Джавахецi шмат тых, хто незадаволены рэжымам. Менавіта іх, на думку афіцыйнага Тбілісі, спрабуюць выкарыстоўваць замежныя разведкі. Грузінскі МУС сцвярджае, што некаторыя мясцовыя няўрадавыя арганізацыі фінансуюцца замежнымі разведкамі з мэтай стварэння атмасферы нацыянальнай напружанасці з перспектывай патрабавання выхаду Джавахецi са складу Грузіі. У якасці доказу спецслужбы прадстаўляюць замежныя тэлефонныя размовы затрыманых актывістаў. Расправа над армянскімі дзеячамі выклікала гучны рэзананс у суседняй Арменіі. Некаторыя сябры армянскага парламенту выступілі ў падтрымку асуджаных. Таксама на бок “серапатыстаў” сталі некаторыя сябры грузінскай апазіцыі. Апаненты Саакашвілі лічаць, што прэзідэнт наўмысна раздувае нацыяналістычную істэрыю, каб адцягнуць увагу грамадства ад апошняй ініцыятывы апазіцыі: яе сябры прынялі агульную дэкларацыю, у якой патрабуюць правядзення датэрміновых прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў.

### ВІКТАР ЮШЧАНКА



Гарант украінскай канстытуцыі выступіў з незвычайным праектам. Ён прапанаваў афіцыйна адзначаць Дзень абаронцаў айчыны не 23 лютага, а 29 студзеня. Гэта дата звязана з падзеямі 29 студзеня 1918 года. У гэты дзень каля вёскі Круты на Чарнігаўшчыне 150 кіеўскіх студэнтаў спрабавалі прыпыніць наступленне 6 тысяч вайскоўцаў Чырвонай арміі, якая змагалася супраць Украінскай народнай рэспублікі (УНР). Бой, які, натуральна, закончыўся перамогай бальшавікоў, з часам стаў часткай украінскага нацыяналістычнага міфу. Украінская супольнасць вельмі крытычна ўспрыняла прапанову прэзідэнта. Па-першае, трэба шчыра прызнаць, што адным актам нельга знішчыць традыцыю святкавання 23 лютага. Па-другое, нават украінскія нацыяналісты мяркуюць, што існуюць лепшыя даты для святкавання Дня абаронцы Украіны. Аргументы наступныя: улетку 1917 года на вернасць УНР прысягнулі каля 300 тысяч вайскоўцаў арміі Расіі (мова пра выхадцаў з Украіны). Аднак з-за правальнай палітыкі Кіева на пачатку 1918 года Цэнтральная рада была ў стане выставіць на фронт толькі 150 студэнтаў. “Хіба гэта падстава для святкавання?” — кажуць украінцы.

### МАНУЭЛЬ НАР’ЕГА




У 1990 годзе дыктатара Панамы, які на дзяржаўным узроўні дапамагаў кантрабандыстам наркотыкаў, узялі ў палон марскія пехацінцы ЗША. Аперацыя такога кшталту супярэчыла ўсім існуючым прававым нормам, аднак міжнародная супольнасць і нават ААН заплюшчылі на гэта вочы. Пасля дастаўкі ў ЗША, Нар’егу асудзілі да 40 гадоў турмы. Дзякуючы добрым паводзінам і рознага кшталту амністыям яму скарацілі тэрмін да 17 гадоў. Цяпер яму час выходзіць, аднак з’явіліся іншыя жадаючыя пабачыць панамца за кратамі. Мова пра Францыю, чый суд завочна асудзіў Нар’егу на дзесяць гадоў за адмыванне грошай. Натуральна, адвакаты Нар’егі просяць памілаваць свайго кліента. Тым больш, што фармальна ад яго імя тады разлічвалася жонка Мануэля, якая цяпер не хоча мець нічога агульнага з былым мужам. Апошняе рашэнне будзе за новым дзяржаўным сакратаром ЗША Хілары Клінтан. Аднак калі яна і адмовіць Парыжу, Нар’ега чакаюць цяжкія часы. Яму, як вольнаму чалавеку, прыйдзецца шукаць краіну, якая пагодзіцца дазволіць яму пражыванне. Між тым, нават у Панаме ідуць размовы пра тое, каб пазбавіць Нар’егу грамадзянства.

СУСТРЭЧА

# ХТО ТАКІЯ “БУДЗІЦЕЛІ”?

**Журналіст Аляксандр Тамковіч, серыя нарысаў якога, прысвечаная знакавым асобам сучаснай гісторыі Беларусі, друкавалася ў “Новым часе” і якая знайшла ўвасабленне ў асобным выданні, прэзентуе новую кніжку — “Будзіцелі”. Пра кнігу і не толькі нам распавёў Аляксандр Тамковіч, калі завітаў у рэдакцыю.**

***— Здаецца, што гэта ўжо чацвёртая кніга за апошнія два з паловай гады?***

— Так, калі лічыць па назвах. Але калі ўлічыць, што тры апошнія маюць англамоўныя аналагі, то ўсяго будзе сем кніг. Я не лічу сябе пісьменнікам у класічным разуменні гэтага слова. Я — журналіст, і ўсе кнігі — гэта прыклад выключна журналісцкай работы. Звычайна, праца над кожнай ідзе больш за год, таму прэтэндаваць за хуткапісанне, на месца ў кнізе рэкордаў Гінеса ніяк не магу. Іншая справа, што амаль усе праекты ішлі паралельна, зрэшты, як і запланаваныя на 2009 год.

***— “Будзіцелі” — не зусім звычайная назва, адкуль яна?***

— На пачатку мінулага стагоддзя ў Чэхіі і Славакіі так называлі тых, хто заклікаў людзей да супрацiву Аўстра-Венгрыі. Былі і іншыя варыянты назвы кнігі, але спыніцца я вырашыў на тым, што падказала Галіна Васільеўна Сіўчык. Сапраўды, гэтыя людзі абуджаюць тых, хто побач.

***— Традыцыйнае пытанне: пра што “Будзіцелі”?***

— Пра жыццёвы выбар. Як напісана на вокладцы: “Прозвішчы некаторых з іх невядомыя для шырокай грамадскасці. Часта ў інфармацыйным фокусе аказваюцца не яны, а іх дзеці і бацькі, жонкі і мужы, браты і сёстры. Між тым, многія з іх пакутуюць не менш, чым тыя, чые прозвішчы ўсе чулі.

Сапраўды, там ёсць тыя, каго ведаюць даволі многія — Зміцер Дашкевіч, Наста Палажанка, Эніра Браніцкая, Артур Фінькевіч. Ёсць мінчане — Мікалай Халезін, Павал Юхневіч, Вячаслаў Сіўчык, і ёсць Сяргей Панамароў — з правінцыяльнага Клецку. Сярод маіх герояў — бацька Цімафея Дранчука, маці Мікалая Астрэйкі і Паўла Севярынца, жонкі Андрэя Клімава і Дзмітрыя Завадскага.

Асобна варта адзначыць інфармацыйную падтрымку Камітэта абароны рэпрэсаваных “Салідарнасць”. Яны сур’ёзна дапамаглі сабраць каардынаты тых, з кім потым былі размовы.

Хачу ўзгадаць адзін цікавы выпадак. Спачатку я запісаў інтэрв’ю з Таццянай Леановіч, жонкай вядомага палітвязня Андрэя Клімава. Праз два месяца яго вызвалілі. Прайшло амаль паўгода. Я пісаў дома інтэрв’ю з маці Андрэя Кіма Таццянай Андрэеўнай і пажартаваў, што канапа ў мяне шчаслівая і хутка яе сына таксама вызваляць. Так і атрымалася.

***— Якія яшчэ планы ў журналіста Тамковіча?***

— Калі Бог дасць, то ў 2009 годзе выйдуць адразу некалькі кніг з тых чатырох праектаў, над якімі я зараз працую. Усе яны амаль гатовыя, таму ў чарзе майго расказу працу не бачыць нейкай заканамернасці. Усе важныя, дарагія, значныя.

Спачатку павінна выйсці кніжка “Лёсы”. Калі хто памятае, першая яе частка выйшла ў 2006 годзе, але сціплым накладам — 600 асобнікаў. У новым выданні хачу дадаць другую частку і “Агульны сямейны альбом”, у якім будзе больш за 130 унікальных фотаздымкаў. Дзве часткі “Лёсаў” — гэта каля сарака інтэрв’ю-маналогаў, дзе вядомыя ўсёй краіне (і не толькі) людзі ўзгадваюць свой жыццёвы шлях.

Другі праект — кніга пад назвай “Без палітыкі”. Гэта размовы менавіта з палітыкамі, але не пра іх палітычную дзейнасць. Палітыкі раскажуць пра свае хобі і захапленні. Напрыклад, Лябедзька — пра футбол, Губарэвіч — пра кактэйлі, Палевікова — пра горныя лыжы, Сініцын — пра зімовую рыбалку. Мілінкевіч успамінае дзіцячае захапленне баскетболам, а Сасноў расказвае, як ён ужо 50 год кожнае лета збірае грыбы. Вельмі цікавая атрымалася рэч, бо мы ведаем гэтых людзей толькі з аднаго боку. А тут зусім іншы ракурс.



А. Тамковіч падчас прэзентацыі яго кнігі

Трэці праект — “Невядомае пра вядомых”. Я яго яшчэ называю “Дыпламаты”. Гэта размовы з тымі амбасадарамі, якія ў Беларусі працавалі раней, і з тымі, хто працуе зараз. Там таксама не будзе амаль нічога пра палітыку або эканоміку, бо ў дадзеным выпадку зрабіць нешта цікавае, па вядомых прычынах, папросту немагчыма. Замежныя дыпламаты раскажуць пра свой шлях у прафесію, пра свае сем’і, звычкі. Памятаеце першага сакратара амбасады ФРГ Хольгера Крэмера, з якім сябравалі і сябруюць да гэтага часу шмат беларускіх журналістаў? З дапамогай электроннай пошты я знайшоў яго ў Афрыцы. Зараз спадар Крэмер працуе ў нямецкай амбасадзе ў Кеніі. А жонка яго — з Мінску. Але… Пра ўсё гэта можна будзе прачытаць.

І самая галоўная задума — у 2009 годзе пройдзе чарговы з’езд Беларускай асацыяцыі журналістаў. Да гэтай падзеі я раблю кнігу “Інтэрв’ю, якіх не было”. Сапраўды, іх рэальна не было. Гэта віртуальныя інтэрв’ю. Іх пішуць мае калегі — журналісты. Я толькі падрыхтаваў агульныя для ўсіх пытанні.

ЮБІЛЕЙ

# АРСЕНУ ЛІСУ — 75 ГОД

Сяргей Гваздзёў

**Арсен Сяргеевіч Ліс, доктар філалогіі, лаўрэат Дзяржпрэміі Беларусі, буйнейшы беларускі навуковец — фальклярыст, літаратуразнавец, краязнавец, гісторык і культуролаг, Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, аўтар больш за 1000 артыкулаў, 15 навуковых манаграфій, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, укладальнік пяці тамоў акадэмічнага выдання Беларускай народнай творчасці.**

Ён яшчэ і аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў пра асобаў, якія сталі ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці, ахвяравалі сабой у імя яе: М. Гарэцкі, Б. Тарашкевіч, А. Смоліч, А. Уласаў, М. Доўнар-Запольскі, Р. Шырма. Асобы, якія паўплывалі на здзяйсненне сённяшняга юбіляра. І пра якіх было яго ці не першае слова.

Калегі па экспедыцыях памятаюць, як у любым куточку Беларусі расчытваў Арсен амаль вынішчаныя часам і людзьмі надпісы на цвінтарах. Надвячоркам ішоў на шпацыр “паўз жыта” слухаць цішыню зорнага неба і маўклівы расповед каласоў пра Беларусь, пра людзей, што адышлі.

Арсен Ліс — навуковец і паэт з вытанчаным музычным слыхам і бездакорным мастацкім густам. Невыпадкова ён працаваў над падрыхтоўкай першай кнігі Уладзіміра Караткевіча.

У 1955 годзе ў часопісе “Беларусь” з’явілася першая публікацыя студэнта Арсена Ліса пра выбітнага і забытага заходнебеларускага мастака Паўла Южыка. Гэта публікацыя сталася пачаткам і яго ўласнага шляху — у навуку і ў навуцы.

Зараз наўрад ці хто здольны ўявіць гісторыю грамадска-палітычнага руху Беларусі без Б. Тарашкевіча, гісторыю мастацтва — без М. Шчакаціхіна, жывапісу — без П. Сергіевіча і Я. Драздовіча, Я. Горыда, першы жыццяпіс якіх належыць пяру Арсена Ліса.

Аднаўленне вартых памяці, знакавых асобаў рабілася яшчэ з 50-х гадоў, калі пачалі вяртацца з лагераў адзначаныя таўром “вораг народа” сведкі часу. Апрача веры ў неабходнасць аднаўлення гістарычнай праўды, аналітычных здольнасцяў, сумлення душы, малады філолаг валодаў значнай грамадзянскай мужнасцю і пэўным спрытам, каб не надта свяціцца перад апекунамі-назіральнікамі.

Не ў самыя спрыяльныя для грамадства часы даходзіў плён ягонай працы да людзей, але даходзіў… Уладам, вядома, карцела прысушыць гэтую не зусім савецкую крыніцу. Тэхналогіі маніпулявання чалавекам не вызначаючца разнастайнасцю і вытанчанасцю, адна з іх — прылашчыць, падкупіць, стварыць умовы руху па службовай лесвіцы. (Надзвычай актуальна, калі на тваім утрыманні жонка з дзвюма дзецьмі). Арсену Лісу, інтэлігенту і гуманітарыю, вельмі настойліва прапанавалі ўступіць у КПСС. Нават угаворвалі. Але не. Адмовіўся, матывуючы тым, што “не лічыць сябе годным гэткага гонару, унутрана не саспеў…” Каб умацаваць, упэўніць “таварыша” ў сімвалах веры, нехта з добразычліўцаў выпісаў на ягоны адрас часопіс “Молодой коммунист”.

Так і жыў, рабіў сваю справу Арсен Ліс — асоба глыбока і самастойна мыслячая, з трывалым унутраным стрыжнем, здольная да супрацiву, не публічная. (У “прэзідыумах ніколі не сядзеў”).

Арсен Ліс надзвычай цікавы субяседнік і дабразычліва-адкрыты дарадца. На пачатку 90-х, калі асобныя прадстаўнікі савецкай партыйнай эліты раптам зацікавіліся нацыянальным пытаннем Беларусі, па кансультацыі не аднаго разу звярталіся да яго.

Днямі пачуў прызнанне вядомага мастака, знаўцы гісторыі культуры Беларусі Уладзіміра Крукоўскага, што пра мастакоў Южыка і Сідаровіча ён даведаўся ад Ліса. Падобныя сцвярджэнні можна пачуць ад думных людзей розных генерацый і спецыяльнасцяў.

Неяк дэпутат Літоўскага Сейму (беларус па крыві) запытаўся ў Ліса: “Як гэта Вам, пан прафесар, маючы такую завершаную сістэму бачання і разумення гістарычнага шляху народа, такія перакананні, удаецца быць, як кажуць, на плыву?”

“Як?.. Трэба немітуслівa і сумленна рабіць сваю справу. Не варта на старыя граблі наступаць…” — па-філасофску адказаў Арсен Ліс.

Абрысы навукоўца-ўніверсала, грамадзяніна і чалавека, якога я люблю і бязмежна паважаю, можна і неабходна ўдакладняць, дадаваць новыя штрыхі і колеры, але, як той казаў, “усё будзе мала”.

Абмяжуемся хіба пажаданнем Арсену Сяргеевічу Лісу напісаць і выдаць новую, галоўную кнігу жыцця, пра Беларусь. На карысць Незалежнай Беларусі.

**Рэдакцыя “НЧ” ганарыцца публікацыямі нарысаў Арсена Ліса на нашых старонках. З днём нараджэння, Арсен Сяргеевіч! Здароўя Вам і новых твораў!**

**ВІНШАВАННЕ**

**Мінская гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы і рэдакцыя газеты “Новы час” шчыра віншуе нястомнага змагара за родную мову, доктара гістарычных навук Леаніда Міхайлавіча Лыча з 80-годдзем.**
**Жадаем здароўя, доўгіх і плённых гадоў працы на ніве адраджэння Бацькаўшчыны.**

**Абвестка**

8 лютага ў Дольнай зале касцёла Святых Сымона і Алены адбудзецца ўрачыстасць з нагоды 80-годдзя доктара гістарычных навук, вядомага грамадскага дзеяча Леаніда Міхайлавіча Лыча.

ГАДАВІНА

# УСПАМІНЫ ПРА ЛЯВОНА БАРАЗНУ

**У мінулым годзе споўнілася 80 гадоў з дня нараджэння Лявона Баразны (1928–1972). Гэта быў мастак шырокага творчага дыяпазону. Ён працаваў у шмат якіх галінах выяўленчага і ўжытковага мастацтва, а таксама ў мастацтвазнаўстве. Галоўная ідэя, якая кіравала ім у творчасці — быць карысным свайму народу. Яго спадчыну складаюць партрэты і пейзажы, габелены і вітражы, этнаграфічныя замалёўкі і мастацтвазнаўчыя працы. Але асаблівае месца займае плён этнаграфічных даследаванняў. У 1950-х гадах Лявон Баразна, па прыкладзе вядомага беларускага мастака Язэпа Драздовіча, вандраваў па Беларусі з вёскі ў вёску, вывучаў народныя строі і арнаментыку. Сабраў багаты і арыгінальны матэрыял, які паслужыў асновай для стварэння унікальнага альбома "Беларуская народная вопратка" (дагэтуль, на жаль, не выдадзенага) ды іншых альбомаў. Вялікае значэнне для вывучэння гісторыі нашага выяўленчага мастацтва і разумення развіцця традыцый мае манаграфія "Гравюры Францыска Скарыны", дзе Лявон Баразна сабраў і сістэматызаваў, зрабіўшы мастацтвазнаўчы аналіз, усе вядомыя гравюры скарынаўскіх выданняў. Акрамя таго, мастак выканаў малюнкі беларускага адзення для 12-томнай універсальнай энцыклапедыі, дзе ўпершыню адлюстраваў гісторыю беларускага касцюма ад XI стагоддзя да нашых дзён. Лявон Баразна трагічна загінуў 15 жніўня 1972 года.**

**Прапануем вашай увазе ўспаміны пра яго Яўгена Куліка. Іх прынёс у рэдакцыю "НЧ" мастак Мікола Купава.**



Сёння ўжо немагчыма прыгадаць, калі і пры якіх абставінах адбылася мая першая сустрэча з Лявонам Баразною. Але затое чуткі пра яго самога, пра некаторыя неардынарныя на той час учынкі і паводзіны даходзілі да студэнтаў тэатральна-мастацкага інстытута даволі рэгулярна і выклікалі ў каго з'едлівыя ўхмылкі: вось, маўляў, знайшоўся дзівак, прэ супраць усіх са сваёй беларушчынай і мужыцкай моваю, а іншыя, больш рафінаваныя, проста лічылі гэта абмежаванасцю ці нават "прыдурью".

Гэта быў час планамернага забівання беларушчыны, калі ўсё нацыянальнае татальна вытоптвалася і выпалвалася, зачынялася і забаранялася саветамі. Замянялася родная гісторыя, рабілася замена на рускае ва ўсім — у звычаях, у абрадах, у мастацкай самадзейнасці. Перакручвалі характар, ментальнасць беларусаў.

Таму прыклад Лявона Баразны, які недзе ў сферах мастацкага фонду і камбіната Белпрамысловасці, не зважаючы ні на што, адкрыта і натуральна пачуваўся беларусам, — нёс сваю беларускасць тым, хто быў здатны ўспрымаць яе, дапамагаў весці сваю, хоць і невялікую, мясцовую барацьбу за, можа, і няясна яшчэ сфармуляваную асабістую нацыянальную годнасць. Потым давялося яго не раз слухаць і бачыць ці то на выставах у салоне-магазіне, ці то на сходах у Саюзе мастакоў, дзе выказванні яго былі абсалютна адкрытымі і без рэверансаў хоць у чыйсьці бок, а часам (як нам, маладзейшым, здавалася) рэзкімі і нават грубаватымі. У яго была мажная, нейкая вольная постаць і рухі, "вечны" швэдар, відаць, працы народных майстрых, што нагадваў сярэднявечную кальчугу, адкрытая і нейкая дзіцячая, хоць і не без хітрай зіхацінкі, усмешка, калі ён падыходзіў да сябра ці аднадумца.

Шэраг сяброў у яго быў вялікі, бо яго, чалавека адкрытага і грамадзейскага, цікавілі ўсе праявы жыцця ў Беларусі: назавем хоць бы імёны Караткевіча і Барадуліна, Шырмы і Цітовіча, ведаў ён і кіраўнікоў дзяржаўных і абласных ансамбляў, і артыстаў-купалаўцаў, і навукоўцаў з акадэміі, сябраваў з мастакамі і музыкантамі. Блізкім сябрам Лявона Баразны быў Зянон Пазьняк. Складвалася ўражанне, ды так яно і было, што яго ў культурніцкіх колах Беларусі ведаюць усе. І, зразумела, ведаюць і пільна апякуюцца тыя, каму па партыйнай пасадзе або па іншай службе трэба было «*пресекать все проявления национализма*». І ворагаў Лявон меў безліч. Не будзем іх тут пералічваць — каго ўжо няма, а хто і сёння прыстасаваўся да новых абставінаў.

Прыгадаю адзін даволі смешны эпізод. Неяк сабралася купка мастакоў ды проста прыяцеляў. Здаецца, там былі Пётр Драчоў, Пётр Свентахоўскі, Барыс Мельнікаў, можа, Мікола Назарчук, быў з намі і Лявон. Намерыліся пайсці на Камароўку, дзе малдаване ў тыя часы гандлявалі разліўным сухім віном, танным і смачным. Прыйшлі і пачалі абыходзіць бочку за бочкаю, каб паспытаць, чыё смачнейшае, — грацыешці, ізабела, кабернэ… Дзе за капейкі, а дзе і для дэгустацыі ў пачастунак за добрае слова і трапны жарт. Лявон, зразумела, быў тут лідэрам. Надэгуставаўшыся і ўбачыўшы побач прылаўкі з садавіной ды іншымі сельгаспрадуктамі, у тым ліку мёдам, заспрачаліся. Захацелі паласавацца ў якасці заедку выпітага. Лявон зацята стаяў на тым, што нікому з нас не адужаць ладнай конаўкі мёду. Пабіліся аб заклад. Гаспадар наліў конаўку, і я рашуча, хоць не быў упэўнены ў перамозе, нагбом стаў піць залацісты, як бурштын, мёд і дапіў-такі да дна. А потым, каюся, каб правучыць саманадзейнага спрачальніка, пад рогат і кпіны сяброў наліў яшчэ слоік мёду з сабой, прычыніў нейкай накрыўкай і, забраўшы яго, сказаў гаспадару, што за ўсё заплаціць вось гэты



Шчамялёў Л. З.
Партрэт мастака Яўгена Куліка

дзядзька. І Лявону хоцькі-няхоцькі давялося расплаціцца. Мы ішлі вясёлыя, нападпітку, а ззаду крочыў Лявон і бурчэў сабе пад нос нешта на наш адрас.

Ён быў чалавекам вельмі дзейным і надзвычай лёгкім на пад'ём. Памятаю, у годзе 1971-м камбінат наладзіў для сваіх работнікаў і мастакоў паездку на аўтобусе ў Прыбалтыку па маршруце Вільня—Рыга—Талін. Сабраліся ў двары камбіната на Някрасава, селі ў аўтобус, ад'язджаем. Раптам на падворку паказаўся Лявон з рукой, суцэльна заматанай ужо даволі зашмальцаваным бінтам, — ці то сабака ўгрызнуў, ці яшчэ што.

— Куды, хлопцы, едзеце?

— Ды вось, у Прыбалтыку.

— А чаму я не еду?

— Дык хто ж ведаў, што ты хочаш? Ды ўжо і позна, ад'язджаем.

— Не, хлопцы, я з вамі! Толькі пашпарт па дарозе трэба захапіць.

Усе пытанні лёсу культуры, мовы, захавання спадчыны яго непасрэдна датычылі і выклікалі актыўныя дзеянні, удзел ва ўсіх пачынаннях, нават у выпадках, здавалася, безнадзейных у тагачасных умовах. Ён бараніў ад знішчэння Намігу, яны разам з Зянонам Пазьняком "прабівалі" і надрукавалі ў "Праўдзе" (цэнтральным партыйным органе КПСС) артыкул, робячы адчайную спробу выратаваць гістарычнае сэрца горада, смела кідаючы выклік усёй манкуртызаванай зграі, якая, нягледзячы на пратэсты, зруйнавала стары свет. Ён выступаў на абмеркаваннях усіх узроўняў супраць так званай "рэканструкцыі" старога горада. Ён браў самы актыўны і непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы святкавання 900-годдзя Мінска. І калі не ўдалося ажыццявіць праект рэканструкцыі старадаўняга замчышча, стварыў разам з аднадумцамі велізарнае пано з выявай старажытнага Мінска. Яшчэ ў 1967 годзе ён распрацаваў праект герба сталіцы, дакладней мадэрнізаваў магдэбургскі герб Мінска з Дзевай Марыяй і анёламі (страшная "крамола"). У Лявона на выяве — таксама жанчына-маці з немаўляткам на руках. Зразумела, праект не прынялі. Сімваламі горада сталі дзве прывакзальныя вежы сталінска-хрушчоўскага стылю.

Ён — падкрэсліваю гэта — быў першым у падзвіжніцкай працы па збіранні народных строяў, арнаментыкі тканін. Быў аўтарам альбомаў (на сорам усім нам, дагэтуль не выдадзеных). Ён "апрануў" ансамблі і самадзейныя калектывы ў арыгінальныя, заснаваныя на сапраўдных народных узорах строі.

Вельмі хвалявала Лявона раз'яднанасць сярод мастакоў у творчым саюзе. Ды і не дзіва. На працягу дзесяцігоддзяў болей за палову сяброў саюзу складалі небеларусы, у лепшым разе абыякавыя да нашых нацыянальных праблем. У пашане былі афіцыйны пафас працы ды партызаны. Мала хто ў творчасці наогул датыкаўся да нацыянальнай тэмы, толькі невялічкая купка мастакоў з надзейна выпаленым таўром "нацыяналісты". У яднанні ўсіх шчырых беларусаў ён бачыў магчымасць будучага адраджэння.

Апошні год жыцця ён быў вельмі заняты працай па ўкладанні і выданні мастацкай спадчыны Францыска Скарыны — гэта яшчэ адзін унікальны прыклад "непрафесійнай" працы Лявона, адраджэнскага універсалізму ягонай асобы.

Яго раптоўная пакутніцкая смерць абрынулася на нас і выклікала літаральна роспач у яго аднадумцаў і прыхільнікаў. Гэтую трагічную вестку прынёс мне ў майстэрню Віктар Шматаў. Я пачаў тэлефанаваць усім, каму мог (гэта было лета — пара адпачынку). А потым паехаў у Зялёны Луг, дзе кватараваў Лявонаў сябар Зянон Пазьняк. Яго не было на месцы, чакаў да вечара, напісаў цыдулку з жахлівай весткаю, паведаміў, што развітанне заўтра.

Труна ў невялікай зале Саюза мастакоў... Памяшканне перапоўненае людзьмі. Сваякі ў жалобе. На сцяне фотапартрэт, абмаляваны чырвона-белым унікальным ручніком са збору Раманюка. Потым дарога ў Талачын. Пахаванне гарачым жнівеньскім днём на мясцовых могілках. Праносяць труну па вуліцах мястэчка. Шмат мясцовых, шмат і прыезджых і, вядома, тых, у каго свае асаблівыя мэты. За жалобным сталом людзі расслабіліся, не стрымлівалі сябе і гаварылі ад душы, не хаваючы патаемных думак пра ўсё, што адбываецца ў Беларусі. Былі часам і вельмі рашучыя і ваяўнічыя заклікі. Сказанае адрыгнулася шмат каму з прамоўцаў. Назаўтра ж пра ўсё, што было на пахаванні, у дэталях ведалі і ў ЦК і ў КГБ.

Суд над забойцамі Лявона ператварыўся ў бясконцы фарс і здзек, з сімуляцыяй вар'яцтва адным з забойцаў, з адмовай і заменай паказанняў некаторых сведак, з імкненнем запляміць Лявона сцвярджэннем, што і "на сонцы ёсць плямы" (характарыстыка Лявона адвакаткай) і асуджэннем "*ребят*" (так называла забойцаў тая адвакатка) да мізэрных тэрмінаў пакарання, неўзабаве скасаваных амністыяй.

Смерць Лявона Баразны згуртавала ўсіх неабыякавых да лёсу Айчыны, да яе культуры. На ўсе пазнейшыя часы гэты чалавек стаў прыкладам самаадданасці, працавітасці, непахіснасці, настойлівасці, апантанасці, самаахвярнага служэння дарагой Бацькаўшчыне. Шмат каму ён адным толькі быццём сярод нас — тых, хто ішоў навобмацак, сваёй прысутнасцю, натуральным беларускім існаваннем узмацніў веру, а ў многіх і распаліў агеньчык любові і цікавасці да сваёй Айчыны, паспрыяў набыццю нацыянальнай самасвядомасці. Гэта асабліва пацвердзілася на пасмяротнай выставе мастака ў 1975 годзе. Яго жыццё, яго творчасць, ягоны лёс выклікалі такую гарачую патрыятычную рэакцыю і палеміку на старонках кнігі водгукаў, такі пошуг эмоцый і клятваў вернасці Беларушчыне і нянавісці да яе душыцеляў, што кніга гэтая стала аб'ектам пільнага вывучэння ў аддзелах КГБ. Водгукі ў ёй леглі ў дасье іх "падапечных" і паслужылі прычынай іх выклікаў у тую ўстанову.

А памяць пра Лявона Баразну і праз столькі гадоў жывая і нязгасная. Хочацца верыць, што гэтая памяць будзе свяціць і нашым наступнікам, і іхным наступнікам. На ўсе часы, пакуль будзе жыць Беларусь.

**Мінск, 4 студзеня 1994 года**

АЛЬБОМ

# “СТАРЫ ОЛЬСА” ВЯРТАЕ Ў ЕЎРАПЕЙСКУЮ МІНУЎШЧЫНУ




Генадзь Кеснер

**У сталічнай страўні “Камяніца” прайшла прэзентацыя новага альбому “Дрыгула” слыннага беларускага фольк-гурта “Стары Ольса”. Шырокая публіка можа пазнаёміцца з новай праграмай калектыву ўжо 14 лютага ў вялікай канцэртнай залі “Мінск”.**

Альбом “Дрыгула” зроблены па матывах “Полацкага сшытку” — зборніка барочнай музыкі. Як адзначыў дудар Зміцер Сасноўскі, выданне альбома сталася магчымым дзякуючы Згуртаванню беларусаў свету “Бацькаўшчына”, а таксама беларускай мецэнатцы з Амерыкі Ірэне Калядзе-Смірновай. Тыражаванне дыску ажыццявіла “Беларуская музычная альтэрнатыва”.

“Вельмі моцна павялічыўся інструментарый нашага гурта, каб выканаць ранняе барока, — распавёў Зміцер Сасноўскі. — У папярэдніх праграмах мы выконвалі позні Рэнесанс, а за барочныя творы баяліся браццa, таму што барока — гэта для суперпрафесіяналаў, і выконваць яго вельмі цяжка. Але зараз мы набраліся нахабства і выканалі. Мы ўпершыню, насуперак крытыцы акадэмічных музыкаў, вырашылі не проста ўзяцца за барока, але выконваць яго на аўтэнтычных інструментах, і ў кожнай нашай кампазіцыі абгрунтавана, чаму там гучаць тыя ці іншыя інструменты. Да таго ж мы вырашылі зрабіць свайго ўзроўню аранжыроўкі, не падобныя на акадэмічныя, якія, паводле нашых апошніх даследаванняў, маглі прысутнічаць у той час”.

Лютніст Ілля Кульбіцкі адзначыў, што ў гэтым альбоме ўпершыню выкарыстоўваліся інструменты, якія ніколі яшчэ не гучалі. “Гэта і трамбамарына (прататып кантрабаса), і рэбек, і цыстра, іншыя канструкцыі. Усе гэтыя інструменты існавалі ў часы барока, і ўсе гэтыя інструменты рабіліся спецыяльна пад гэты новы альбом”, — падкрэсліў музыкант. Таксама ў альбоме ўпершыню гучыць і беларуская дуда так званага нямецкага тыпу, якая ўстанаўліваецца на плячы.

Што да зместу, то, як адзначыў Зміцер Сасноўскі, у альбоме ёсць танцы, якія не сустракаюцца нідзе, акрамя “Полацкага сшытку”. “Напрыклад, танец “Дрыгула”, па якім мы і назвалі гэты альбом. Польскія даследчыкі пішуць, што ён не сустракаецца ні ў польскіх, ні ў чэшскіх крыніцах — нідзе. Але па самой назве можна здагадацца, як яго таньчыць, — кажа лідэр “Старога Ольсы”. — “Полацкі сшытак” складаецца з чатырох частак, але мы выконваем свецкую, танцавальную музыку, якая мае альбо еўрапейскае паходжанне, але ў ёй зменена мелодыя, зменены ноты, і сыграна па-свойму, альбо гэта танец свайго паходжання, але запісаны так, што сягае на ўзровень заходнееўрапейскіх. То бок, гэта кангламерат самых папулярных мелодый”.

Акрамя танцаў з “Полацкага сшытку” ў альбом увайшлі камерныя творы Валянціна Бакфарка — лютніста і кампазітара венгерскага паходжання, які жыў у Вільні ў XVI стагоддзі, — аднаго з самых славутых віртуозаў-лютністаў эпохі Рэнесансу, стваральніка прынцыпова новай тэхнікі ігры на інструменце, заснаванай на выкарыстанні дасягненняў вакальнай паліфаніі.

Маюцца на дыску і творы Андрыяна ле Роя — французскага лютніста, кампазітара і выдаўца XVI стагоддзя. На вокладцы дыска выкарыстаны фрагменты выявы з беларускага касцельнага твору “Скокі смерці” XVII стагоддзя, які захоўваецца ў музеі кляштара брэгітак у Гродна.

Што тычыцца канцэрта “Старога Ольсы” 14 лютага, то ён ладзіцца ў межах грамадскай акцыі “Будзьма” пры падтрымцы кампаніі “БелПІ” (“Беларускае піва”) і страўні “Камяніца”. Дарэчы, пасля прэзентацыі альбома “Дрыгула” кампанія “БелПі” прэзентавала для прысутных і пяць гатункаў свайго кароннага напою — “Крамбамбулі”.

ВЕРНІСАЖ

# ВЯРТАННЕ МАСТАКА

Сяргей Гваздзёў

**Не дужа людна, але ўрачыста было апоўдні 29 студзеня ў кавярні «Добрыя мыслі». Нагодай стаўся вернісаж заходнебеларускага мастака “віленскай школы” Паўла Южыка (1874–1944).**

Калекцыя, прадстаўленая ў экспазіцыі, сфарміравана на падставе твораў, якія належаць Смаргонскаму краязнаўчаму музею, і ўзбагачаная некалькімі работамі з прыватных збораў. Прэзентавана выстава грамадскім творчым аб’яднаннем “Мастак”. Куратар — мастацтвазнаўца Тацяна Гаранская.

У адрозненні ад іншых творчых постацяў, што зніклі з беларускіх абсягаў, Паўла Южыка, ураджэнца Смаргоншчыны, трохі ведалі, ці, хутчэй, нешта чулі пра яго. Ён не быў забаронены, рэпрэсаваны ці абсалютна забыты, але імя яго не мела розгаласу, а творчы даробак заставаўся незапатрабаваным.

Мінулае не перайначыш, але досвед яго існуе для будучыні… Менавіта для будучыні і ўласнага сумлення Надзея Емельянаўна Маркава, руплівіца беларушчыны, галоўны захавальнік Смаргонскага краязнаўчага музея, узімку і восень, цягам не аднаго года абыходзіла навакольныя вёсачкі. Пакуль у 1989 годзе не выйшла на след мастака, не адшукала яго працы. Цікава, што іх грашовы эквівалент на той час намесніца дырэктара па навуцы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР вызначыла адразу і канкрэтна: “Можна даць уладальніцы карцін па пяць рублёў за кожную”, — параіла яна калегам з правінцыі. Нагадаем, столькі каштавала тады кіло каўбасы.

Дзякаваць Богу, нешта змяняецца пад аблокамі, змяняецца ў мысленні. Новая генерацыя кіраўніцтва Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі хоць і не ўсё можа, але ўсведамляе “наяўнасць запазычанасці” галоўнага храма мастацтва перад беларускім народам. І шмат робіць, каб выправіць становішча. На адкрыцці выставы, апрача іншага, гаворка ішла пра запачаткаванне модных зараз дзяржаўна-грамадскіх камісій, пра адраджэнне мастацтвазнаўчых экспедыцый, пра стварэнне музея прыватных калекцыяў, музея заходнебеларускага мастацтва, шырэй — музея беларускай культуры. Але відавочна, што справу гэтую мажліва агараць толькі разам — грамадзянскай супольнасці і дзяржаве, сцвярджаючы тым самым, што мы адзін народ.

Нацыянальны мастацкі музей плануе паказаць работы Южыка. Упэўнены, хоць і не “першы”, але пакажа. Хаця б пад восень, з нагоды 70-х угодкаў аб’яднання Беларусі. Карціць даведацца, які падарунак нас чакае — выстава, прысвечаная аб’яднанню Заходняй Беларусі, выстава Заходнебеларускага мастацтва ці “два ў адным” — з тых твораў, што ёсць “пад рукой”? Шараговае мерапрыемства ці сапраўдная падзея? Як адзначыў на адкрыцці выставы Паўла Южыка доктар мастацтвазнаўства Яўген Сахута: “Неспазнанае мастацтва Заходняй Беларусі — гэта самы сапраўдны кантынент”.



Павел Южык. Сваячніца

Пакуль жа трэба падзякаваць арганізатарам за цудоўную мажлівасць хоць пару дзён публічна, а не ў музейным сховішчы, пабачыць жывапіс высокага прафесіянала Паўла Южыка, “карцінам якога, — як адзначыла ў буклеце да выставы Тацяна Гаранская, — характэрна трапяткая перадача прыгажосці і ўменне майстра віртуозна перадаць праз сціплы сюжэт на невялікім палатне веліч прыроды і чалавека ў ёй”.

## АФІША

**13 лютага клуб «Рэактар»**

Metallection прадстаўляе фэст «Пятніца 13» з удзелам гуртоў: «Asguard», «Nightside Glance», «Weeping Twilight», «Soulsides», «The Dim Sun» і інш.
**Пачатак 18.00.**
**Квіткі ад 18000 да 25000.**
**Даведкі па тэл. +37529 6490888.**

**14 лютага**
**вялікая зала к/з Мінск**

Прэзентацыя новага альбома «Дрыгула (Полацкі сшытак)» гурта «СТАРЫ ОЛЬСА».
Пачатак 19.00.
**Квіткі ад 15000 да 35000.**
**Даведкі па тэл. +37529 6490888.**

**15 лютага**
**Палац Прафсаюзаў**

Канцэрт барда і акцёра Віктара Шалкевіча.
**Пачатак 19.00.**
**Квіткі ад 15 000 да 25 000.**
**Даведкі па тэл. +37529 6490888.**

**20 лютага клуб «Рэактар»**

Штогадовы фэст-трыбʼют NIRVANA, прысвечаны дню народзінаў Курта Кабэйна. Удзельнічаюць гурты «Zaniapad», «Мутнае Вока», «Голая Манашка», «Determine», «In Joy», «LikBez», «Псіхоз».
**Пачатак 17.30.**
**Квіткі ад 18000 да 25000.**
**Даведкі па тэл. +37529 6490888.**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад **12.01**.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
www.novychas.org; novychas@gmail.com.
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 6.02.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.